ПРОЛЕТАРЫЦ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! ПАНЯДЗЕЛАК, 7 ЛІСТАПАДА 1938 г. № 61 (403) ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

Няхай жыве XXI гадавіна Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі ў СССР!
Няхай жыве вялікі, непераможны сцяг Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна! Няхай жыве ленінізм!



УРАЧЫСТАСЦЬ СОЦЫЯЛІЗМА

Народы вялікай краіны соцыялізма, пролетарыі і прыгнечаныя капіталістычных краін, усё перадавое і прагрэсіўнае чалавецтва святкуе сёння XXI гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР.

Гадавіна Вялікага Кастрычніка — інтэрнацыянальнае свята вялікай рэволюцыйнай сілы. 7 лістапада 1917 года — важнейшая памятная дата XX стагоддзя. Яна паклала пачатак новай гісторыі чалавецтва.

21 год назад на адной шостай часткі свету мільёны эксплоатуемых упершыню нашчэнт раздавілі сваіх эксплаататараў, экспрапрыіравалі сродкі вытворчасці, заўладалі ўсімі матэрыяльнымі багаццямі краіны і прыступілі да пабудовы новага грамадства — грамадства без класаў, грамадства без эксплаатацыі чалавека чалавекам.

Свет раскалоўся на два непрымірымых лагеры: лагер соцыялізма і лагер капіталізма. У смяртэльнай барацьбе паміж сабой пераможа той з іх, на чыім баку арганізаваны ў дзяржаўную сілу розум прагрэсіўнага класа, той, да якога накіраваны сімпатыі, любоў і падтрымка мільёнаў прыгнечаных ва ўсім свеце, той, які ўвасабляе ў сабе і практычна ажыццяўляе заветную мару працоўнага чалавецтва — комунізм. Перамога за намі. Перамога за соцыялізмам.

І мы перамагаем.

Мы перамаглі ў кастрычніцкім паўстанні. У жорсткай барацьбе з усімі ворагамі соцыялістычнай рэволюцыі атрымалі рашаючую перамогу на ўсіх франтах, стварылі эканоміку соцыялізма, ліквідавалі апошні паразітычны клас — кулацтва, пабудавалі соцыялістычнае грамадства.

У рэзультаце двух сталінскіх пяцігодак СССР ператварыўся ў магутную соцыялістычную дзяржаву і зараз паспяхова вырашае задачу «завяршэння будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да комуністычнага грамадства».

У святле вырашэння гэтай гістарычнай задачы праміпуўшы 21-шы год соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР быў годам далейшых буйнейшых перамог соцыялізма, перамог сусветна-гістарычнага значэння. Вянцом гэтых перамог з'явілася Сталінская Канстытуцыя.

Перамогі рабочых і сялян СССР, перамогі комуністычнай партыі большэвікоў ёсць перамогі міжнароднага рабочага класа, міжнароднага комуністычнага руху. Партыя большэвікоў, партыя Леніна—Сталіна — перадавы атрад комунізма — арганізатар і кіраўнік гэтых перамог. І імёны Леніна і Сталіна прагучаць сёння на ўсіх мовах свету як магутны рэволюцыйны, баявы кліч.

Таму сцяг комуністычнай партыі, сцяг большэвізма — чырвоны сцяг соцыялістычнай рэволюцыі сёння высока ўзнят над светам мільёнамі рук рабочых і сялян. На гэтым сцягу напісана толькі адно слова: перамога.

У перадавых калонах мільённых народных мас, святкуючых сёння перамогі Вялікага Кастрычніка, ідзе і наша рэспубліка.

Усяго 20 год аддзяляюць Савецкую Беларусь ад яе ранейшага становішча поўфэадальнай калоніі расійскага імперыялізма, бяспраўнай вотчыны ўсялякіх паразітаў: польскіх паноў, рускіх памешчыкаў і розных дамарослых крывасмокаў. Гэта была нават не краіна, а ўскраіна, «край»: край сахі і балот, край невымернай галечы і неасушаных слёз. Яе так і называлі: «Паўночна-заходні край».

Дзе ён цяпер, гэты «край» — былая жабрацкая Беларусь? Няма яго. Соцыялістычная рэволюцыя, сталінскія пяцігодкі ператварылі адстаўшую эканамічна і культурна Беларусь у перадавую, квітнеючую народным багаццем і здароўем сваіх грамадзян індустрыяльна-калгасную соцыялістычную рэспубліку — надзейны фарпост братняга саюза свабодных народаў на заходніх рубяжах СССР. І толькі там, за краем небасхілу ценем мінулага пазіраюць з-за граніцы лахманы яе роднай сястры — Заходняй Беларусі, акупіраванай польскім фашызмам.

Вялікі соцыялістычныя дасягненні Савецкай Беларусі за годы Кастрычніцкай рэволюцыі. З года ў год узрастае прадукцыя яе соцыялістычнай прамысловасці, павышаецца ўраджайнасць калгасных і соўгасных палёў. Шырыцца плошча садоў і гародаў. Ва ўсіх галінах павышаецца прадукцыйнасць працы — самае важнае ў будаўніцтве соцыялістычнага грамадства. На аснове ўсяго гэтага шпарка ўзрастае дабрабыт працоўных: рабочы, калгаснік, інтэлігент пачынаюць жыць з пакрыццём усіх сваіх матэрыяльна-бытавых і культурных запатрабаванняў. Разгортваецца новае будаўніцтва ў гарадах і калгаснай вёсцы.

Расцвітае духоўная творчасць нашага народа — навукі, мастацкая літаратура, тэатральнае, выяўленчае і музычнае мастацтва. З глыбінь народных вырастаюць усё новыя і новыя таленты, арганізатары вытворчасці на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Вырастаюць тысячы Стаханавых, Папаніных, Грызадубавых, Дземчэнка — герояў і гераінь соцыялістычнай працы, перадавых людзей навукі і культуры. Былыя рабочыя, саматужнікі, сяляне-беднякі і батракі — сёння інжынеры, старшыні калгасаў, дырэктары МТС і буйных прадпрыемстваў, дзяржаўныя дзеячы; іх дзеці канчаюць інстытуты, становяцца прафесарамі, аграномамі, урачамі, настаўнікамі. Усюды бурліць кіпучая дзейнасць. Абуджаныя рэволюцыяй сілы народа знайшлі сабе шырокае прымяненне ў стварэнні новай культуры новага чалавечага грамадства.

Упэўнена і моцна расце Савецкая Беларусь у сям'і аднінаццаці роўнапраўных рэспублік пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

А ці такой яшчэ была-б яна, калі-б на працягу ўсіх гэтых год не тачылі яе малады арганізм розныя контррэволюцыйныя гады — троцкісцка-бухарынскія і нацыянал-фашысцкія паслугачы подлых вырадкаў капіталістычнага варварства — нямецкага і польскага фашызмаў. Яны разгромлены слаўнымі органамі НКВД, але рэшткі іх яшчэ не дабіты.

Таму і сёння, святкуючы перамогі Вялікага Кастрычніка, ні на мінуту нельга паслабляць пільнасці, ні на мінуту нельга паслабляць дысцыпліну ў радах.

Свет стаіць напярэдадні новай імперыялістычнай вайны. Гэта вайна пачалася ўжо і неўпрыкмет уцягвае ў сваю арбіту ўсё больш і больш краін і народаў. Не сёння — заўтра яна можа абрушыцца на бацькаўшчыну працоўных усяго свету—СССР: фашызм робіць апошнія прыгатаванні да гэтага. Таму трэба штохвіліны памятаць указанне нашага правадыра таварыша Сталіна: трымаць краіну, трымаць увесь наш народ у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам ваеннага нападу звонку.

Мы ўпэўнена глядзім уперад і смела ідзем насустрач будучаму. Мы будуем комунізм і мы яго пабудуем. Ніякія сілы нам не перашкодзяць. Гераічны народ наш не дасць сябе ў крыўду. Зарукай таму — наша магутная Чырвоная Армія і Чырвоны Флот, наша комуністычная партыя на чале з лепшым стратэгам рэволюцыі І. В. Сталіным. Зарукай таму — маральна-палітычнае адзінства нашага народа, любоў і беззаветная адданасць нашага народа сваёй соцыялістычнай радзіме, адданасць сваёй соцыялістычнай радзіме мільёнаў прыгнечаных ва ўсіх капіталістычных краінах.

Сёння соцыялізм святкуе сваю ўрачыстасць на адной шостай часткі свету. Заўтра ён заўрачыстуе на ўсім свеце. Настаў 22-гі год соцыялістычнай рэволюцыі. Час і гісторыя працуюць на нас, працуюць на комунізм.

Няхай жыве вялікі непераможны сцяг Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна!

Няхай жыве ленінізм!

А МЫ САБЕ СЕЕМ і СЕЕМ...

ЯНКА КУПАЛА

1.

А мы сабе сеем і сеем
Пшаніцу і радасць, і кветкі,
Ачышчаным сеем насеннем
Шчаслівыя нашы палеткі.

Над Тэмзай, над Сенай, над Віслай,
Над чорным Берлінам, над Рымам
Крывавая хмара завісла,
Крывавым сланяецца дымам.

Мадрыд абступілі бандыты
З Берліна і Рыма, як спруты,
І путы куюць ненасытна,
Народу свабоднаму путы.

У Прагу разбойнікаў зграя
Залезла і грабіць там нівы,
З-пад Токіо зброд самураяў
Катуе Кітай няшчаслівы.

А мы сабе сеем і сеем
Пшаніцу і радасць, і кветкі,
Ачышчаным сеем насеннем
Шчаслівыя нашы палеткі.

Гудкі нашых фабрык, заводаў
Складаюць нам песні і думы,
І сэрцы прасторам, свабодай
Калышуць нам трактараў шумы.

Шляхі нам далёка, адкрыта
Ляглі ва ўсе свету староны;
На шлях, ружай-кветкай спавіты,
Бяды не нашле груган чорны.

Стаіць наш страж на граніцах,
Вартуе ад чорнай напасці
І нашы загоны з пшаніцай,
І наша вялікае шчасце.

І мы сабе сеем і сеем
Пшаніцу і радасць, і кветкі,
Ачышчаным сеем насеннем
Шчаслівыя нашы палеткі.

II.

З усмешкай мы жыццю глядзім у вочы,—
Судзіла доля шчасце на вяку, —
Збіраем кветкі-папараці ў почы,
Днём з ясным сонцам ходзім нал-руку.

Квяцістыя шырокія дарогі
Кабэрцам перад намі ў свет ляглі,
Заранкі сцелюць промені пад ногі
Па ўбранай па-святочнаму зямлі.

Для нас цвітуць сады і агароды,
І жытнія звісаюць каласы;
Галубяць думкі, ллюць нам асалоду
Жывою гутаркай бары, лясы.

Растуць, цвітуць сады і вінаграды,
У сонцы спеюць сочныя плады;
На травах сочных у лясных прысадах
Пасецца статак рослы, малады.

Багацце ў нашым маладым прыселлі
З павагаю засела на куце,
І клапатліва ў будні і ў нядзелі
Пшанічны каравай для нас пячэ.

Мы, гордыя сваёю доляй, воляй
І добрай славаю паміж людзей,
Імкнемся з поглядам вакол саколім
Ды сочым бег тварэння і падзей.

Дзе пустка поруч з вечным ліхалеццем
Са зверам дзікім самапас жыла,
Паўсталі гарады і свету свецяць
Снапамі яркімі жыцця й святла.

Каналамі злучылі мора з морам,
Стан Волга абняла Масква-ракі,
Плывуць па сініх караблі прасторах,
Плывуць, куды не плавалі вякі.

І над зямлёй пануем у высотах,
І над зямлёй лунаюць караблі.
Як мёд пчала збірае рупна ў соты,
Збіраем скарб з зямлі і з-пад зямлі.

Рэк быстрабурных воды запынілі,
Плацінамі скавалі іх гульню,
І асвятляюць моц далі воднай сіле
Электрыкай савецкую зямлю.

І там пайшла вада, дзе неба спекай
Высушывала поле і пасеў,
Дзе адно голад пасвіў чалавека
Ды дзіка вецер-сухавей свісцеў.

Збудзілася зямля і падзямелле,
Збудзілася, што спала доўгім сном;
Пяскі сухія рунню зарунелі,
З-пад скал медзь палілася ручаём.

Ракой, фантанамі з зямлі б'е нафта,
Б'е стуль, скуль і не сніў прыгонны дзед,
І вугаль з-пад зямлі, з вугольных шахтаў,
У скірты сыпіцца на белы свет.

Плыве, гудзе шум гулкі, будаўнічы
Па ўсёй краіне вольнай з краю ў край.
Зязюля годы радасныя ліча,
І песняй жаўранкавай звоніць гай.

З усмешкаю жыццю глядзім у вочы,
Жыццё нясе нам свой багаты дар,
Нясе, а сонцам разбудзяе ночы
Руплівы наш Крэмлёўскі гаспадар.

Менск, 3-XI-38 г.

—o—

РОДНАЙ КРАІНЕ

ЯКУБ КОЛАС

Мы з гордасцю і радасцю глядзім
На сонечны свой шлях,
Не пройдзены ў гісторыі нікім,
Не бачаны ў вяках.
Нас Ленін вёў праз буры і агні,
Як волат і Баян.
У памяці не меркнуць тыя дні,
Жыве між нас тытан!
Алмазамі, рубінамі сляды
Дарог яго гараць.
Як радасна цябе, край малады,
Сягоння прывітаць!
Такі прастор, куды я ні зірну!
Так цвёрд і смел твой крок!
Бурліць жыццё, шуміць, як у вясну
Нястрымапы паток.
Снапы твайго іскрыстага святла
Расходзяцца шырэй.
Узносіцца краіна, як скала,
Усё вышэй і дужэй.
І людзі новыя, краса і цвет
Савецкае зямлі,
За гэты час, за дваццаць слаўных лет
Радзіліся, узраслі.
Іх сэрца — жар, а воля іх — граніт,
Парыў — арліны ўзлёт,
І высака ўзнімаюць на свой шчыт
Краіну і народ.
Хай свет стары вайной на нас ідзе,
Каб наш спыніць разбег, —
Спакойны мы, бо Сталін нас вядзе,
Наш геній, наш стратэг.

ВЕРШ ПРА ЧЫРВОНЫ СЦЯГ

Сталіца вітае ўрачыстае свята.
Будынкі ўпрыгожаны. Сцягі. Плакаты.
І яснае сонца ў асенняе ранне
Глядзіць на людзей, што ў святочным убранні,
Спяваючы песні, праходзяць па бруку...
Партрэты трымаюць узнятыя рукі
Над шумнай, як мора, калонай народа,
Якая стаіць каля брамы завода.
Дзяўчына трымае ў руках над калонай,
Высока ўгары, сцяг агніста-чырвоны.
Гляджу на яе, падміргнуў ёй... Іпоўку
Яна ўсміхнулася мне па-сяброўску.
Глядзіць на мяне і сказаць як-бы хоча:
«Чаго ты здзівіўся?.. Калона рабочых,
Даверыўшы, мне гэты сцяг ўручыла,
Бо я сваёй працай яго заслужыла!..
Мне гонар, пашана ў рабочай калоне!
Падумай-жа сам, з такім сцягам чырвоным
Калісь комунары ў Парыжы паўсталі
І ў бітвах за праўду пад ім паміралі.
Са сцягам такім-жа і нашы народы
У змаганні для нас здабывалі свабоду.
Пад посвіст шрапнелі байцоў эскадроны
На белых ляцелі са сцягам чырвоным
І сцяг гэты слаўны абмочан крывёю
Забітых у бітвах народных герояў.
На Полюсе смелы Папанін з сябрамі
Узняў гэты сцяг над сівымі ільдамі.
На вежы Крэмля сцяг савецкай дзяржавы
Узвіваецца горда, авеяны славай.
Японцы у бітвах хасанскімі днямі
Пазналі, што сцяг наш ніхто не заплямíць!
Запомняць навекі ўсёй зграяю чорнай,
Што там, на вяршку вышыні Заазёрнай,
Дзе сцяг шалясціць, сцяг савецкай краіны,
Ніхто гэты сцяг аніколі не скіне!»
У твар ёй глядзеў я, глядзеў над калонай
На сцяг гэты слаўны, агністы-чырвоны...
Калона кранулася ў гэту хвіліну,
А сам я жадаў-бы сказаць да дзяўчыны:
«Зайздрошчу табе! Я-б заняў тваё месца,
Каб сцяг у калоне самому мне несці»!

Мікола АУРАМЧЫК.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР

АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ЭКІПАЖА САМАЛЁТА „РОДИНА“

За ажыццяўленне гераічнага беспасадачнага дальняга пералёту па маршруту Масква—Далёкі Усход, устанаўленне жаночага міжнароднага рэкорда дальнасці палёту па прамой і за праяўленыя пры гэтым выдатную мужнасць і вытрыманасць —

1. Прысвоіць званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна:

ГРЫЗАДУБАВАЙ Валянціне Сцяпанаўне — камандзіру экіпажа самалёта «Родина».

ОСІПЕНКА Паліне Дзянісаўне—другому пілоту самалёта «Родина».

РАСКОВАЙ Марыне Міхайлаўне — штурману самалёта «Родина».

2. Выдаць адначасовую грашовую ўзнагароду ўдзельнікам пералёту—тт. Грызадубавай В. С., Осіпенка П. Д. і Расковай М. М. па 25 тысяч рублёў.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР М. КАЛІНІН.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль,
2 лістапада 1938 г.



АБАРОНА БАЦЬКАЎШЧЫНЫ ЁСЦЬ СВЯШЧЭННЫ АБАВЯЗАК КОЖНАГА ГРАМАДЗЯНІНА СССР!

З А Г А Д
Народнага Камісара Абароны Саюза ССР

7 лістапада 1938 г. *№ 236* *г. Масква*

Таварышы чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі!

Віншую вас з 21-й гадавінай Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі ў СССР.

З года ў год расце і мацнее наша радзіма — вялікі Совецкі Саюз. Як гранітны ўцёс высіцца ён сярод мутнага мора капіталістычнага хаоса, усяляючы мільёнам тружанікаў і прыгнечаных усяго чалавецтва надзеі на збаўленне ад капіталістычнага рабства, злобу і страх нашым класавым ворагам.

Прайшоўшы год, як і ранейшыя прынёс Совецкаму Саюзу новыя перамогі і дасягненні ва ўсіх галінах гаспадарчага, палітычнага і культурнага жыцця. Наша социялістычная дзяржава, якая не ведае эканамічных крызісаў, увяла ў строй і ў прайшоўшым годзе новыя гіганты індустрыі, павялічыла прамысловую прадукцыю і нязменна развівала на базе сучаснай тэхнікі сваю соцыялістычную сельскую гаспадарку.

У нашай краіне, даўно забыўшай аб фабрыканце і памешчыку, не ведаючай беспрацоўя, з дня ў дзень, з месяца ў месяц павышаецца дабрабыт працоўных, усіх грамадзян нашай дзяржавы.

Совецкая навука і культура за прайшоўшы год дасягнулі новых і выдатных поспехаў. Вучоныя, інжынеры і тэхнікі ўсіх спецыяльнасцей і работнікі мастацтва сваімі дасягненнямі паказваюць бязмежнасць развіцця навукі і культуры ва ўмовах социялістычнага ладу. Жанчына — роўнапраўны грамадзянін краіны Советаў, роўна з мужчынам ставіць стаханаўскія рэкорды ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, перамагае на самалёце матэрыкі, робіць навуковыя адкрыцці. Героі Совецкага Саюза тт. Грызадубава, Осіпенка і Раскова — гэтыя нашы выдатныя жанчыны, не адзінкавы, з імі ў ногу ідуць сотні і тысячы совецкіх жанчын, паказваючы ўзоры выдатнейшых дасягненняў ва ўсіх галінах творчасці і працоўнага жыцця.

На фабрыках і заводах, у калгасах і рудніках, у Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце, ва ўсіх галінах навукі і ў мастацтве, скрозь і ўсюды кіпіць творчая работа па ўмнажэнню матэрыяльных і духоўных багаццяў нашай слаўнай социялістычнай радзімы.

Зусім не тое ў капіталістычным свеце. Ён цалкам паграз, заблытаўся ў сваіх уласных невырашальных супярэчнасцях. Так званыя «старыя дэмакратыі» ў паніцы шукаюць выхаду з тупіку гэтых супярэчнасцей у фашызме. У Еўропе паступова, але няўхільна ліквідуюцца апошнія рэшткі буржуазнай дэмакратыі.

У Совецкім Саюзе поўнасцю ажыццёўлена Сталінская Канстытуцыя, самая дэмакратычная, самая свабодная, самая перадавая Канстытуцыя ў свеце.

Прайшоўшы год быў годам магутных дэманстрацый маральнага і палітычнага адзінства ўсяго нашага народа — рабочага класа, калгаснага сялянства і совецкай інтэлігенцыі. Яны прадэманстравалі сваю бязмежную адданасць партыі Леніна—Сталіна і совецкаму ўраду. На выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і Саюзных рэспублік увесь народ аддаў свае галасы блоку камуністаў і беспартыйных, ватыраваў за дыктатуру рабочага класа, за соцыялізм.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна совецкі народ і ў прайшоўшым годзе бязлітасна прэсякаў, карчаваў, як і надалей будзе прэсякаць і выкарчоўваць злачынную работу варожай агентуры трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў, змоўшчыкаў, дыверсантаў і шкоднікаў. Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія мае і будзе мець самы моцны і надзейны тыл.

21-ю гадавіну свайго існавання Совецкі Саюз святкуе ў абстаноўцы ўзрошчай ваеннай небяспекі. Ачагі вайны, запаленыя фашызмам на захадзе і ўсходзе, разгараюцца ў новую, другую сусветную імперыялістычную бойню. Падзеі апошніх месяцаў у Цэнтральнай Еўропе і ўзброеная інтэрвенцыя ў Іспаніі і Кітаі з'яўляюцца наглядным таму пацвярджэннем. Народныя масы Іспаніі і Кітая самааддана і доблесна адстайваюць сваю незалежнасць і права на жыццё, не гледзячы на тое, што войскі інтэрвентаў не абмяжоўваюцца ваеннымі дзеяннямі на палях сражэнняў, а бязлітасна разбураюць мірныя гарады і сёлы, знішчаючы тысячы і тысячы ні ў чым непавінных мужчын, жанчын і дзяцей. Еўропа ў цяперашні час прадстаўляе сабою ўжо не «парахавы пограб», а цэлы «арсенал з выбуховымі матэрыямі», гатовы ў любы момант ад першай іскры ўзляцець у паветра.

Перад тварам гэтай небяспекі перад тварам новай сусветнай бойні і нападу на Совецкі Саюз, Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія заўсёды будзе напагатове. Наша армія развіваецца і расце разам з ростам усёй краіны. 21-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі яна сустракае новымі поспехамі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы і ў справе далейшага авалодання рознастайнай і высокай ваеннай тэхнікай. Нашы байцы, камандзіры і палітработнікі, бязмежна адданыя сваё радзіме, совецкаму ўраду і партыі Леніна—Сталіна, з'яўляюцца надзейнымі абаронцамі дзяржавы рабочых і сялян. Разграміўшы ў сваіх радах здраднікаў і шпіёнаў, Чырвоная Армія стала яшчэ маналітней, яшчэ больш моцнай.

Чырвоная Армія заўсёды гатова да абароны совецкай зямлі ўсёй сілай сваёй магутнасці ад пасяганняў усякіх ворагаў. Нядаўнія баі ля возера Хасан паказалі ўсю сакрушальную сілу нашай доблеснай Чырвонай Арміі. Байцы, камандзіры і палітработнікі, перамогшы ўсе труднасці, стойка абаранялі совецкія рубяжы і доблесна адбілі напад ворага, які прабаваў прымяніць свае ўлюбёныя «метады» на тэрыторыі Совецкага Саюза.

Падзеі ля возера Хасан гэта толькі эпізод, «разведка боем» з боку праціўніка нашых сіл. Праўда, гэта разведка абышлася яму вельмі дорага, аднак падобнага роду налёты не выключаны і надалей. Чырвоная Армія павінна быць на-чаку, гатовай адказаць на ўдар двайным ударам.

Зараз, калі тэрміны перадышкі скарачаюцца і гарызонт пакрыт свінцовымі хмарамі вайны, трэба памятаць, што перамога куецца да вайны, у штодзённай упорнай арганізаванай працы, вывучобе і трэніроўцы.

«...трэба ўсямерна ўмацціць і ўмацаваць нашу Чырвоную армію, Чырвоны флот, Чырвоную авіяцыю, Асоавіяхім. Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку...»

Гэта сталінскае ўказанне павінна праводзіцца ў жыццё ўсёй масай радавога і начальніцкага састава РСЧА. Мы, армія соцыялізма, заўсёды павінны памятаць сваю гістарычную місію — ахраніць, адстаяць ад усіх і ўсялякіх ворагаў нашу радзіму, фарпост новага чалавецтва.

Чырвоная Армія да гэтага заўсёды гатова. Яна сваю гатоўнасць будзе павышаць, удасканальваць, шліфаваць.

Няхай жыве наша слаўная магутная соцыялістычная радзіма!

Няхай жыве непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія!

Няхай жыве Усесаюзная партыя большэвікоў, арганізатар соцыялістычнай рэволюцыі, партыя, якая вядзе нашу краіну па шляху перамог!


Няхай жыве наш вялікі Сталін!

НАРОДНЫ КАМІСАР АБАРОНЫ САЮЗА ССР МАРШАЛ СОВЕЦКАГА САЮЗА

К. ВАРАШЫЛАЎ.

ПЕСНЯ ПРА ПОЯС

Музыка І. Любана *Тэкст М. Клімковіча*



Каля рэчкі, каля віру
Залацісты лёг пясок.
Там дзяўчыне я на памяць
Даў шаўковы паясок.

Каля рэчкі, каля віру
З-ёй я ночкі каратаў.
А над намі у парэчках
Салавейка шчабятаў.

Ды прышлі паны-палякі
Хмарай чорнай у сяло.
І над шчасцем нашым гора
Цяжкім каменем лягло.

Абняславіў пан дзяўчыну,
Не знясла пакут яна.
Я над вірам каля рэчкі
Думаў думу да відна.

Не апалі ў поле росы —
Пад ударам партызан
Мёртвым лёг атрад палякаў;
Збег адзін пракляты пан.

З тых часоў нашу я пояс
Любай дзеўчыны сваёй.
На магіле каля віру
Я тады пакляўся ёй:

«Будзе час — ізноў у бойку
Свой атрад я павяду,
Ці над Бугам, ці на Вісле,—
Толькі пана я знайду.

За дзяўчат маёй краіны,
За рабочых і сялян —
Назаўсёды знікне з свету
Ненавісны польскі пан».

Запяваць песню пачынае барытон, а са слоў «Залацісты лёг» спявае барытон разам з тэнарам. Апошнія два куплеты спяваюцца больш хуткім тэмпам.

УСПАМІНАЮЦЬ ДНІ БЫЛЫЯ

Па дарозе, па шырокай,
Па глушы лясной
Ехаў полк байцоў здалёку, —
Быў закончан бой.

Полк спыніўся каля гаю,
Ля Дняпра-ракі,
Заспявалі ў вольным краі
Песню казакі.

Што за мілая, за песня —
Баявы задор!
Разлілася як прадвесня
Між нізін і гор.

Зашумеў і луг, і нівы,
Над ракой чарот...
Весяліўся край шчаслівы,
Лікаваў народ.

А напеў, такі суровы,
Ліўся, не змаўкаў,
Адклікаліся дубровы,
Стэп ім падпяваў!

***

А цяпер на той паляне,
Ля Дняпра-ракі,
Адвячоркамі гулянне
Водзяць казакі.

Успамінаюць дні былыя,
Векапомны год!..
І казачкі маладыя
Водзяць карагод!

Бандурысты-цымбалісты
Лёгка ў струны б'юць,
Баяністы галасіста
Граюць і пяюць.

І прывольна, і шчаслівa,
У роскваце зямля!
І лікуе Украіна
Вольная мая.

А калі памкнуцца банды
У родны край, у мой —
Дасць нарком тады каманду:
— Воіны — на бой!

І памчацца эскадроны,
Грозныя палкі,
Нашых коннікаў чырвоных
Заблішчаць клінкі.

Праз шумлівыя дубровы,
Па глушы лясной,
Пойдзем зноў мы за наркомам,
Ды ў апошні бой!

А. БЯЛЕВІЧ.

Саколік

Прысвячаю Саколіку — сыну адважнай лётчыцы Валенціны Грызадубавай.

Рана, рана ўстаў Саколік,
Ён даўно не бачыў мамы.
Цераз рэкі, горы, поле
Прыляцела тэлеграма.
Сёння ў Маскву здалёку
Мама родная прыбудзе,
Выйдзе на вакзал шырокі,
Вось узрадуюцца людзі!
З ёй Марына, з ёй і Поля —
Мамы верныя падругі,
Хутка падбяжыць Саколік,
Скажа ён:
— Вазьмі на рукі!
— Раскажы, як ты лятала?
Мама весела ўсміхнецца:
— Вырас як, я ледзь пазнала!
І прытуліць блізка к сэрцу.
Вырас ён за цэлы месяц.
Два гады Саколік мае.
Паляцеў-бы аж пад месяц,
Ды бабуля не пускае!
Добра мець такую маму,
Што нічога не баіцца
І ляціць праз буры прама,
Як адважная арліца.
Не раздружацца ніколі
Тры падругі, гераіні.
Любіць горача Саколік
Цёцю Полю і Марыну.
А мацней за ўсіх на свеце
Любіць ён таго
Героя,
Хто даў радасць нашым дзецям,—
Даў дзяцінства залатое!
Пройдуць годы і Саколік
Стане сокалам адважным,
Паляціць над морам, полем, —
Снег, тайга яму не страшны.
Паляціць на полюс дальні,
Ён падымецца высока.
І вялікі, мудры Сталін
Скажа:
— Малайчына, Сокал!

Эдзі АГНЯЦВЕТ.



Карціна мастака Г. Ланге «Фрунзе пад Уфой». (Побач з Фрунзе Чапаеў). (Саюзфото).

Святочны падарунак

(УРЫВАК З АПАВЯДАННЯУ НЯМЕЦКАГА ПІОНЕРА)

—о—

А. ЯКІМОВІЧ

—о—

Я УЖО расказваў вам пра свайго брата Ганса. Апрача ўсяго іншага, ён гаваркі і вясёлы, ніколі не сумуе. Гора, бяда ў хаце, — а ён возьме сваю гітару і іграе. Праўда, гітара ў такія часіны плача, а не іграе.

І вось, неяк раптам нібы хто падмяніў Ганса. Не той стаў Ганс. Думае ўсё аб нечым. Дзень, другі думае. Загаворы да яго — не чуе. Альбо гляне разгублена і вінавата ў вочы, нічога не адказаўшы. Штосьці няладнае з ім сталася...

На трэці дзень, улучыўшы час, калі нікога не было ў хаце, я проста запытаўся ў брата:

— Што з табою, Ганс? Аб чым ты ўсё думаеш?

Брат паспрабаваў усміхнуцца:

— А хіба відаць, што я думаю?

— Дзіва што відаць, кажу. Я каб не бачыў...

— Дык ты, Карлуша, мо' бачыш і мае думкі?

— Думак то я не бачу, — адказаў я, стараючыся выклікаць брата на адкрытую размову. — Мо' ў ячэйцы што здарылася?

— Цікаўны ты, Карлуша!

Брат змоўкнуў, разглядаючы мяне, як незнаёмага. Я-ж тым часам не спускаў з яго вачэй. Няўжо ён утоіць ад мяне свае думкі?

Звычайна, раней гэтага не бывала.

Ганс пахлопаў мяне па плячы і сказаў:

— Так, Карлуша. Я ўсё думаю, думаю, і нічога не магу прыдумаць...

— Можа, я дапамагу табе думаць?— кажу.

— Нажаль, не...

— Шкада, — расчаравана сказаў я. — А ўсё-ж...

Цяпер мне яшчэ больш хацелася даведацца пра тайну Гансавых думак. Ужо хоць-бы ён змаўчаў, нічога не сказаўшы.

— Я думаю, — сказаў брат, і я адразу павесялеў ад гэтых слоў, — як прабрацца незаўважаным на завод...

Тут я зусім вытрашчыў вочы.

— Ну, ясна, — сказаў брат, — табе хочацца ведаць усё...

Дзіва што хочацца! Жарты сказаць— прабрацца на завод, значыць, не так сабе, без дай прычыны. Завод ваенны. Кругом варта ходзіць. А ля варот аж два штурмавікі стаяць. Рабочыя, дык тыя там і жывуць на заводзе, у бараках, за высокай калючай агарожай, і калі выпускаюць іх у адлучку ці ўпускаюць назад, — ператрасуць да ніткі. Вось тут і прабярыся, ды яшчэ рабочаму чалавеку, ды яшчэ незаўважаным!

— Ідзі, Карлуша, гуляй. Табе яшчэ рана галаву ламаць аб такіх справах, — сказаў брат.

Я не спрачаўся. Рана, дык рана. Тайна, значыць! А. што такое тайна ў нашай рабоце — я ведаў не горш за брата. Я пайшоў на двор, паўзганяў, няма-ведама для чаго галубоў з-пад страхі; ударыў свінчо, якое церлася каля ног, і вышаў на агароды шукаць морквы: можа дзе яшчэ засталася незаўважанай дагэтуль. Увесь час з галавы не выходзіў Ганс і завод. Завод ад нас недалёка, за рэчкай. Ён добра відаць з агарода. Высачэзныя дзве трубы, крытыя бляхаю будынкі, высокі, як лес, плот з калючай агарожай. Турма — не завод. Раней гэта быў звычайны слясарны завод, а зараз фашысты вырабляюць там розную зброю для вайны. Улетку мы падганяліся туды блізка з каровамі.

А труба?.. — раптам успомніў я, і тут-жа кінуўся ў хату.

— Ганс! — закрычаў я ад радасці.— Не трэба думаць!

Не трэба думаць? — Ганс глядзіць на мяне сваімі добрымі блакітнымі вачыма.

— На завод можна прабрацца праз.. трубу!

І я расказаў ашаломленаму такою навіною Гансу, як мы ўлетку, пасучы кароў, выпадкова знайшлі ў лагчыне блізка ад завода жэрала трубы. Труба гэтая вядзе на заводскі двор. Мы спрабавалі залазіць у яе, але там слізка і цёмна.

Ганс з ахвотаю выслухаў усё, што я ведаў пра трубу. Увечары, як сцямнела, ён папрасіў мяне павесці паказаць яму гэтае месца. Па дарозе Ганс расказаў, для чаго яму патрэбна прабрацца на завод. Ячэйка пастанавіла расклеіць на заводзе лістоўкі і вывесіць чырвоны сцяг у дзень свята Кастрычніцкай рэволюцыі ў СССР. На заводзе ёсць антыфашысты, але пранесці лістоўкі і сцяг яны не могуць. Аб гэтым ячэйка і даручыла падумаць Гансу.

Жэрала трубы было, аднак, не па Гансавых плячах. Галава пралазіць, а плечы — не.

— Пусці мяне, — шапчу я.

Брат вылез, нездаволена цмокаючы.

— Ты то ўлезеш, але што з гэтага?— кажа ён.

— А тое, што я магу за цябе і на завод прабрацца...

— Баяцца будзеш... — безнадзейна паматаў галавою Ганс.

— Ты пастаіш тут, каб смялей было. Я-ж лазіў улетку...

Ганс маўчыць. Нешта думае.

— А ведаеш, Карлуша: ты, бадай, праўду кажаш. Другой рады няма, хоць і шкада мне цябе.

— Яшчэ што ўздумаў — шкадаваць! Думаеш, я горш за цябе ўмею лазіць, хоць-бы і па трубах?..

***

Праз некалькі дзён, калі ўсё было гатова, брат сказаў мне:

— Сёння, Карлуша, пойдзем...

Сёння, дык сёння. Я гатоў. Брат расказаў, што мяне роўна ў дванаццаць гадзін ночы каля выхаду з трубы будуць чакаць два рабочыя-антыфашысты, аб чым ужо дагаворана. Яны забяруць у мяне пасылку і я вярнуся той-жа дарогаю назад. Лістоўкі і сцяг былі запакаваны ў торбачку.

Гадзін у адзінаццаць мы пешком падаліся за вёску. Ноч была цёмная і сырая. Пад нагамі чвякала гразкая зямля, зверху цярушыла густая імжа. Мы стараліся ісці як мага цішэй. Перайшлі мост, потым пайшлі лугамі. Чаравікі набраклі ад вады і неміласэрна шлёпалі, што нам зусім не падабалася. Папацёмку мы нават заблудзіліся і доўга шукалі лагчыны з трубой. Труба, як даведаўся брат, была зроблена для адводу бруднай вады з завода. Цяпер, як завод стаў ваенным, праведзена новая каналізацыя, і старая труба была непатрэбнай. Нам то, наадварот, яна была вельмі патрэбна.

Калі мы знайшлі, нарэшце, трубу, было дванаццаць гадзін.

— Жадаю, Карлуша, поспеху,—сказаў брат. Не бойся толькі... Я буду чакаць. Ліхтарык у цябе?

— У мяне, — кажу.

Брат прывязаў мне за нагу торбачку з пасылкай для завода, і я палез. Раней я і не думаў пра страх. Цяпер-жа, калі я апынуўся ў цёмнай, вузкай нары, мне стала неяк вусцішна. Паўзці было нязручна. Я поўз на локцях і на каленках. Чым далей, тым рабілася цяжэй. Локці балелі і млелі рукі. Паветра было затхлае, я задыхаўся, праз кожную хвіліну спыняючыся адпачыць. Трэба сказаць, што труба гэта доўгая, метраў сто, калі не болей.

Так прапоўз я шагоў мо' з дваццаць, як раптам пачуў спераду якісьці рэзкі піск. Я спыніўся. Прыслухаўся. Адступлення, аднак, для мяне не было. Назад не вернешся. Трэба паўзці ўперад, і — хутчэй! Я падняў ліхтарык, потым, прыладзіўшыся, дастаў з кішэні складанчык. Узброіўшыся так для смеласці, зноў папоўз далей. Святло ад ліхтарыка разганяла цемру, але не болей, як на шагоў два. За гэтай светлай прагалінкай стаяла густая маўклівая цемень. Сценкі і трубы мокрыя і слізкія. Горш за ўсё баяўся я сустрэцца са змеямі. Аднак, на заводскім двары даўно чакаюць, і мне няма калі разважаць пра змей. За мною ўслед паўзе туга напакаваная торбачка. Што-б там ні было, я павінен яе даставіць на завод. Сотні рабочых чакаюць гэтага святочнага падарунка і будуць рады яму, як дарагому госцю.

Неўзабаве заўважыў я ў паласе святла дзве чорныя цені. Яны зычна піскнулі і зніклі ў цемрыве. Пацукі! Бадай вас ліха! Напалохалі толькі.

Але чым далей я прабіраўся, тым усё больш і больш пацукоў трапляла пад святло майго ліхтарыка. Відаць, я гнаў іх перад сабою, збіраючы з усёй трубы. Яны загароджвалі дарогу і пагражальна пішчалі. Хаця варта было мне махнуць ліхтарыкам, як пацукі тут-жа знікалі ў цемры: неспадзяванага святла ў нары яны, відаць, баяліся больш, як мяне.

Выпаўз з трубы я ледзь жывы. Два рабочыя даўно сядзелі ў звалачнай яме, чакаючы мяне. Яны былі не мала здзіўлены, калі раптам з трубы пасыпалі на іх чароды пацукоў...

Я аддаў рабочым торбачку, а сам, крыху адсопшыся на свежым паветры, нырнуў назад у трубу, пакуль пацукі зноў не захапілі яе... Цяпер, хоць і стомлены, я поўз хутчэй і смялей. Заданне ячэйкі было выканана!



Новая гасцініца ў Менску. Зарысоўка А. Ждана.

У ШПІТАЛІ

Толькі пасля восьмага ранення лейтэнант Цярэшкін згадзіўся пакінуць поле боя. (З газет).

Наўкол цябе шпіталя ціш,
І ты, як гэта ціш, ляжыш...
Знадворку вецер... Дружа мой,
Ён, свежы, просіцца ў пакой:

На коўдру, як на гладзь ракі,
Асыпаць кветак лепесткі,
Пахучых кветак. На зары
Табе прынеслі іх сябры.

Каб водыр лета і палёў
К табе любоўю іх дайшоў;
Каб сілы крэплі, і ты сам
Убачыць мог блакіт Хасан;

Убачыць сопкі, дзе ў баю
За родны край, зямлю сваю,
За свой народ да змогі сіл
Ты куляй ворага касіў;

Убачыць насыпы зямлі,
Дзе трупы ворага ляглі,
Адтуль мы, смелы лейтэнант,
Цябе прынеслі: восем ран...

Цяпер маўклівы ты ляжыш:
Вартуе сон твой гэта ціш.
Цвіце букет, што на зары
Табе паставілі сябры.

Крапіся, дружа, слаўны ўзвод
Спаткаць чакае твой прыход,
Каб разам жыць — адной сям'ёй;
Калі-ж патрэбна будзе ў бой, —
Пайсці зноў смела за табой.

Алесь БАЧЫЛА.



Інтэрнат інстытута Наргаса ў Менску. Зарысоўка А. ЖДАНА.

НЯХАЙ ЖЫВЕ НАША СОВЕЦКАЯ, НАРОДНАЯ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ! БОЛЬШ УВАГІ ПАЛІТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ І БОЛЬШЭВІЦКАЙ ЗАГАРТОЎЦЫ СОВЕЦКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ!

ДА ПРЭМ'ЕРЫ СПЕКТАКЛЯ «ЧАЛАВЕК З РУЖЖОМ» У ДЗЯРЖАЎНЫМ ВІЦЕБСКІМ ТЭАТРЫ БССР

ПАЧЭСНАЯ ТВОРЧАЯ ЗАДАЧА

У творчай біяграфіі кожнага мастака ў пэўны час наступае вельмі адказны момант — рашаючы для яго творчай дзейнасці. У гэты момант робіцца ацэнка мінулай працы, усяго, што зроблена, і раскрываюцца з вялікай яснасцю перспектывы.

Такім рашаючым момантам маёй творчай біяграфіі з'явілася работа над вобразам Леніна. Стварыць вобраз Леніна — самая пачэсная, самая велічная і самая адказная задача для кожнага мастака. Гэта — грандыёзная і творчая і палітычная задача.

Мне выпаў вялікі гонар працаваць над вобразам Леніна ў спектаклі «Чалавек з ружжом». Падыходзячы да работы над вобразам, я разумеў, наколькі складанай будзе гэта работа. Велічны, шматгранны вобраз Уладзіміра Ільіча захапіў і натхніў мяне. Працаваў шмат. Часамі прыходзіла думка, што не хопіць майстэрства, не хопіць ведаў для таго, каб здаць гэты сур'ёзнейшы для кожнага мастака экзамен.

17 кастрычніка быў першы грамадскі прагляд спектакля. Я ішоў на спектакль з думкай, што знаходжуся на правільным шляху, што правільна вырашаю сваю творчую задачу. Але калі надыйшоў момант выхаду на сцэну, калі ўсе погляды гледачоў і таварышоў па рабоце — актораў былі накіраваны на мяне — выканаўцу ролі Леніна, — мяне ахапіла надзвычайнае хваляванне. Разам з тым я адчуваў сканцэнтраванасць усіх сваіх сіл, пачуццяў і думак.

Выйшаў на сцэну. З усіх бакоў лавінай хлынулі апладысменты. Глядач падбадзёрыў. Вельмі цёпла была прынята сцэна сустрэчы Леніна з Шадрыным. Хвалююча цёпла сустрэлі гледачы фінал. Гэта надзвычай узрадвала. Гэта ўпэўніла, што вобраз ствараецца правільна.

І пасля гэтага першага спектакля хваляванне не пакінула мяне. Я думаў: якую радасць, якое шчасце знайшоў я ў жыцці. І міжволі паўстаў прад мной увесь мой жыццёвы шлях.

Успомніў бацьку свайго, сельскага музыканта, селяніна-бедняка. Успомніў жабрацкае жыццё. Успомніў бязрадаснае маленства і словы бацькі: «Вучыся, вучыся, мой сын. Хоць ты выйдзі на шырокую дарогу, здабудзь сапраўднае чалавечае жыццё».

І гэта жыццё здабыта — радаснае, шчаслівае, творчае жыццё! Я выведзен сваёй радзімай на шырокі, сонечны творчы шлях.

Зараз, працуючы над вобразам Леніна, я як ніколі адчуў неабходнасць і карыснасць маёй работы, работы совецкага інтэлігента ў агульнай справе будаўніцтва нашай соцыялістычнай культуры.

Работу над вобразам Леніна я распачаў задоўга да таго, як тэатр прыступіў да пастаноўкі п'есы «Чалавек з ружжом». Вывучаў творы Леніна, асабліва прамовы і работы, якія адносяцца да 1917 года. Прыступіўшы да работы над вобразам у спектаклі «Чалавек з ружжом», я яшчэ і яшчэ раз чытаў, вывучаў ленінскія творы.

Надзвычайную карысць дала кніга М. Горкага аб Леніне, успаміны Н. К. Крупскай, успаміны рабочых аб Леніне і г. д. У гэтых матэрыялах я знайшоў шмат дэталей, якія раскрывалі прада мною велічны вобраз Уладзіміра Ільіча.



З вялікай увагай вывучаў я матэрыялы і экспанаты музея Леніна ў Маскве і філіяла гэтага музея ў Ленінградзе. Калі я адчуў, што да некаторай ступені тэарэтычна падрыхтаваны, я распачаў канкрэтныя пошукі дэталей і рысаў, патрэбных для стварэння сцэнічнага вобраза, — пачаў вывучэнне паходкі, голасу, стылевых асаблівасцей мовы Ільіча. У гэтым — у пошуках фізічнага падабенства — мне шмат дапамаглі дакументальныя і мастацкія фільмы аб Леніне, фотаздымкі, скульптуры, работы мастакоў. Шмат разоў праслухоўваў я пласцінкі з запісам прамоў Леніна.

Акрамя гэтага, мне дапамаглі сустрэчы з людзьмі, якія бачылі і ведалі Уладзіміра Ільіча. Былыя чырвонагвардзейцы, рабочыя, якія сустракаліся з Ільічом, з вялікай цеплынёй і шчырасцю, з вялікім хваляваннем і захапленнем расказвалі мне аб Ільічу — аб яго абаяльным абліччы, цудоўнай прастаце, надзвычайнай чуласці, аб ім—вялікім правадыру, палкім трыбуне рэвалюцыі, генію чалавецтва.

Асабліва шмат мне дала гутарка з тав. Е. Яраслаўскім. Гэта гутарка дала мне магчымасць праверыць маю работу і ўпэўніцца ў правільнасці сваіх думак, свайго разумення вобраза Ільіча. Гутарка ўпэўніла, што я іду па правільнаму шляху.

Працаваць над вобразам Ільіча можна ўсё жыццё, бо няма граніц дасканаласці ў гэтай выключнай пачэснай рабоце.

У спектаклі «Чалавек з ружжом» я паставіў сваёй творчай задачай паказаць Леніна як правадыра і арганізатара народных мас, як вялікага трыбуна рэвалюцыі, як мысліцеля і як самага простага і самага «чалавечнага чалавека». Як удалося мне справіцца з вырашэннем гэтай задачы — скажа наш глядач, якому мы ў дні XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі паказваем першыя спектаклі «Чалавека з ружжом».

П. МАЛЧАНАЎ.
Актор Дзяржаўнага Віцебскага драматычнага тэатра.

ТАЛЕНАВІТАЯ МОЛАДЗЬ

Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр па сутнасці малады тэатр, яму ўсяго 18 год. Ён сапраўднае дзецішча Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі. Ён заснаван у дні вызвалення Чырвонай Арміяй Беларусі ад белапольскіх акупантаў у 1920 годзе.

Варта прыгадаць і тое, што нават вядучая група актораў тэатра, так званыя «старыя» акторы фактычна пачалі сваю прафесіянальную акторскую дзейнасць у нашым тэатры, тут выраслі і сфарміраваліся, як майстры сцэны.

Выдатны майстар беларускага тэатра заслуж. арт. БССР В. Н. Крыловіч да прыходу ў наш тэатр у 1921 годзе ўсяго 2—3 гады папрацаваў на украінскай напоўаматарскай сцэне. У нашым тэатры расцвіў яго талент, раскрыліся яго здольнасці.

У Белдзяржрамтэатры выраслі і набылі вядомасць заслж. арт. БССР В. І. Уладамірскі, артысты Рахленка, Зораў, Платонаў і інш.

За апошнія некалькі год выраслі і раскрыліся цікавыя сцэнічныя дараванні ў маладых актораў тт. Бараноўскага, Пекура, Краўцова, Шацілa, артысткі т. Амельянюк.

Моладзь у Беларускім Дзяржаўным драматычным тэатры складае пераважную большасць калектыва, і можна з усёй шчырасцю сказаць, што ніякага разрыву паміж маладымі і старымі працаўнікамі тэатра няма. Калектыў жыве адзінай дружнай сям'ёй.

Няма патрэбы шмат гаварыць аб тым, што роля і значэнне комсамольскай арганізацыі ў тэатры выключна адказная і ўдзячная. Палітычнае выхаванне моладзі, актыўны ўдзел у творчым жыцці тэатра, разгортванне соцыялістычных метадаў працы і г. д.—тут безліч вялікіх і малых пытанняў, якія павінны быць узняты комсамольскай арганізацыяй.

У калектыў тэатра ўступіла маладая актрыса, комсамолка Зіна Бравaрская, толькі-што паспяхова скончыўшая вучобу ў Маскоўскім дзяржаўным тэатральным інстытуце імя Луначарскага па класу народнага артыста СССР Тарханава. Прайшоўшы ўвесь курс вучобы на выдатна, Зіна Браварская выпушчана з інстытута з дыпломам першай катэгорыі. Яна будзе дэбютыраваць перад менскім гледачом у гэтым сезоне ў ролі пані Ядзі ў драматычнай паэме М. Клімковіча «Кацярына Жарнасек».

Сымон Глікман прышоў да нас з былога ТРАМ'а. За яго спіной ужо досыць вялікі вопыт практычнай работы на сцэне. Ад першых спроб у дзіцячым тэатры пры піонерскім клубе, праз уже сталую прафесіянальную работу ў ТРАМ'е ў складаных ролях Тарцюфа ў камедыі «Тарцюф» Мальера, Салоўскага ў п'есе «Арыстакраты» Пагодзіна, Густава Куфке ў п'есе «Працяг будзе» Бруштэйн, у якіх ён выступаў перад гледачом, да роляй, выкананых на сцэне нашага тэатра,— гэта досыць актыўны творчы шлях для маладога яшчэ, па сутнасці, актора.

На сцэне Белдзяржрамтэатра Сымон Глікман выступае ў ролях Вінберга ў «Вочнай стаўцы» бр. Тур і Л. Шэйніна, Мілаўзорава ў камедыі А. Астроўскага «Без віны вінаватыя», студэнта ў «Непакойнай старасці» Л. Рахманава.

Юрый Пушкевіч таксама ўжо не першы год працуе ў нашым тэатры. Ён прышоў у Белдзяржрамтэатр у 1930 годзе з драматычнага гуртка Віцебскага кааператыўнага тэхнікума, дзе ён быў кіраўніком і акторам. Юрый Пушкевіч—комсорг комсамольскай групы тэатра. У пастаноўцы «Партызаны» К. Крапівы ён выконвае ролю Міхаля, у «Платоне Крачаце» А. Карнейчука—шофера Васю.

У моладзі нашай краіны шырокая перспектыва ва ўсіх галінах мастацтва, навукі і тэхнікі. Яна мае ўсе магчымасці для росту сваёй культуры, развіцця сваіх талентаў. Наша моладзь ведае пра гэта і, як нідзе ні ў якой другой краіне свету, смела і ўпэўнена крочыць наперад, заваёўваючы ўсё новыя і новыя вышыні на славу нашай краіны, нашай магутнай комуністычнай партыі і яе геніяльных настаўнікаў — правадыроў Леніна і Сталіна.

Е. РАМАНОВІЧ.



Рабочы момант рэпетыцыі спектакля «Кацярына Жарнасек» у Белдзяржрамтэатры. Арт. З. Браварская ў ролі Ядзі і арт. Б. Аляксеенка ў ролі Яся.

НАТХНЁНЫЯ РАДЗІМАЙ

Талентаў у народзе непачатая крыніца. Патрэбна была Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя, каб крыніца гэта выйшла наповерх. Шмат цёплага і добрага можна расказаць аб прафесіянальных кадрах мастацтва Совецкай Беларусі.

Комсамол, як клапатлівая маці, росціць і выхоўвае сваіх сыноў і дачок. Комсамол вырасціў, напрыклад, такога таленавітага беларускага мастака, як Е. Зайцаў, такіх растучых жывапісцаў, як М. Манасзон, С. Андруховіч і П. Гаўрыленка. Комсамол дапамагаў расці такім скульптарам, як А. Глебаў і А. Орлоў, комсамол вырасціў такога буйнага беларускага архітэктара, як А. Воінаў.

Адны з іх прышлі да свята з вялікімі работамі, а тыя, хто яшчэ зусім малады, — прынеслі на гэта свята свае творчыя мары. І тыя і другія — шчаслівыя. Першыя тым, што ім што-небудзь удалося зрабіць, другія — што яны ў хуткім часе зробяць, бо ў нашай краіне перад моладдзю адкрыты ўсе шляхі да выканання яе творчых жаданняў.

Комсамолец Е. Зайцаў, выпускнік Акадэміі мастацтваў, зрабіў вялікую, тэхнічна спелую і хвалюючую карціну «Апошні бой Чапаева». Зайцаў вучыўся і працаваў як сапраўдны комсамолец, глыбока і ўдумліва. Ён сам выязджаў на месца апошняга боя Чапаева пад Уральскам, гутарыў з удзельнікамі гэтага боя, рабіў шматлікія зарысоўкі з гэтых удзельнікаў, вышукваючы найбольш характэрныя і моцныя вобразы.

Зайцаў стварыў сапраўды гістарычную карціну, якая раскрывае вобраз легендарнага Чапаева. Гэты вобраз хвалюе: глядач бачыць перад сабою Чапаева, параненага і выведзенага таварышамі з боя, але адчуваецца, што і ў гэтыя апошнія хвіліны свайго жыцця Чапаеў увесь у агні барацьбы за рэвалюцыю.

Мужнасць і адвага ў імя радзімы! Гэтыя тэмы хвалююць усіх нашых мастакоў.

Вось перад намі аснежаны лес і пралягаючая праз лес дарога. У баку ад дарогі, схаваўшыся за ствалом дрэва, чырвонаармеец і партызан залеглі ля кулямёта, гатовыя скасіць свінцом набліжаючыхся белапалякаў. Гэта карціна «У засадзе», напісаная мастаком П. Гаўрыленка. З гэтай карцінай пераклікаецца вялікае палатно М. Манасзона. На карціне мастак паказвае трыумф барацьбы беларускага народа з белапалякамі: Чырвоная Армія ўступае ў Менск, радасна сустрэтая насельніцтвам вызваленага горада.

У фарбах і скульптуры ўслаўляюць нашы мастакі гераічную армію, совецкіх пагранічнікаў. Маладыя беларускія скульптары А. Глебаў і А. Орлоў працуюць над цікавай скульптурнай групай пагранічніка і калгасніцы, якія праследуюць парушальніка граніц. Удала перададзена ў гэтай групе развіццё дзеі пагранічнага эпізода. Калгасніца паказвае рукой у бок выяўленага ёю парушальніка, пагранічнік выхопвае з кабуры наган, адначасова спускае з павадка дазорнага сабаку, пачуўшага ўжо блізкасць ворага і гатовага кінуцца на яго. Вораг не ўцячэ! Гэта скульптурная група будзе выстаўлена перад фасадам беларускага павільёна на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Краіна будуецца. Яна збірае, часам, маладых беларускіх мастакоў на будаўнічых рыштаваннях. Так сустрэліся на будаўніцтве Палаца піонераў у Менску маладыя беларускія архітэктары Воінаў і Вараксін, якія зрабілі праект палаца, з беларускімі жывапісцамі і скульптарамі, аформіўшымі палац жывапісам і скульптурай.

Шмат чаго беларускімі мастакамі ўжо зроблена, але яшчэ больш ім прадстаіць зрабіць.

А. ДАЛІН.

—О—

СПЕКТАКЛЬ АБ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЕ

«ЛЮБОЎ ЯРАВАЯ» Ў РУСКІМ ТЭАТРЫ БССР

«Любоў Яравая» напісана К. Трэнёвым 14 год назад. Упершыню пастаўлена ў Малым тэатры ў 1926 годзе. Пастаноўшчык гэтага спектакля Л. М. Празароўскі цяпер піша: «Калі б мне прышлося ставіць гэту п'есу нанава., я палічыў-бы неабходным і магчымым многае і многае пераглядзець. Многае прыбраць і многае прынесці і паглыбіць». Правільна! Нельга цяпер «Любоў Яравую» ставіць і іграць так, як ігралі яе раней. Інакш адчуваецца эпоха і людзі.

«Любоў Яравую» мы хочам паказаць гледачу як народна-гераічнае паданне аб барацьбе большэвікоў, аб барацьбе народа за родную зямлю, за новае, шчаслівае і радаснае жыццё, аб ворагах — белагвардзейцах, аб настаўніцы Яравой, як яна стала верным таварышам большэвікам, аб камісару Кошкіну, матросу Швандзе, прафесару Гарнастаеву, прыслузе Дуньцы, пра салдата Пікалава, пра паручыка Яравога...

Мы хочам стварыць спектакль стыльны, але не стылізаваны. Наша задача—аднавіць рэчаіснасць такой, якою яна запечатлелася ў паэтычнай свядомасці народа.

К. Трэнёў, аўтар п'есы, нядаўна пісаў: «Задачай п'есы было даць перш за ўсё палітычны і соцыяльны фон, а ўжо на ім, у арганічнай залежнасці ад яго, гісторыю і драму гераіні і героя». Вось іменна «перш за ўсё... фон». Гэта спецыфічная асаблівасць п'есы Трэнёва, яе галоўная вартасць: тое, што робіць яе вялікім палатном, тое, чым тлумачыцца яе жывучасць. Гэта-тое, што абавязан улічыць тэатр пры пастаноўцы «Любві Яравой».

Фон гэты — не кулямётная траскатня ці гарматныя стрэлы, не тыфозныя вошы ці брудныя анучкі, а перш за ўсё — людзі з іх рознастайнымі адносінамі да рэвалюцыі. Настаўніца, афіцэр, машыністка, дзеяч тыла, вартаўнік, пакаёўка, спекулянтка, электратэхнік, селянін, вахмістр, падпольшчык, ліберальны чалавек, пратаіерэй, палкоўнік, генерал... — цэлая галерэя вобразаў.

Цяпер аб грамадзянскай вайне мы ведаем шмат больш, чым ведалі тады, калі прымалі ў ёй непасрэдны ўдзел, і нават шмат больш, чым у мінулым і пазамінулым годзе — да працэсаў трацкісцкіх і іншых бандытаў. Таму на многае цяпер трэба паглядзець «свежымі і цяперашнімі вачамі», як раіў Гогаль калісьці. З усёй шматграннасці тэм «Любві Яравой», мы вылучаем тэму шпіянажу і здрадніцтва, раскрываючы такім чынам сучаснаму гледачу крыніцы гэтай подлай з'явы.

А. ДАНАЦЦІ.
Мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР.

—О—

„ЛЕЙБКЕ—САЛДАТ“

У Дзяржаўным яўрэйскім тэатры заканчваецца работа над пастаноўкай п'есы «Лейбке—салдат» І. Левіна, прысвечанай XX-гадоваму юбілею ленінска-сталінскага комсамола і XXI гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

У рабоце над пастаноўкай разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж асобнымі цэхамі тэатра. Рад актораў узялі на сябе індывідуальныя соцыялістычныя абавязацельствы.

Вялікая работа праароблена калектывам тэатра з аўтарам п'есы—акторам тэатра І. Левіным.

П'еса «Лейбке—салдат» напісана аўтарам на матэрыяле беларускага мястэчка 1914—16 гг. Аўтар рысуе карціну збядненне і разбурэння яўрэйскіх працоўных мас пад ударамі імперыялістычнай вайны. П'еса паказвае абурэнне шырокіх працоўных мас супроць імперыялістычнай вайны і як паспявае ў народзе ідэя рэвалюцыі. У п'есе паказана роля комуністычнай партыі як ідэйнага кіраўніка і арганізатара працоўных мас.

П'еса напісана каларытнай мовай. Аўтарам выкарыстан фальклор і народныя песні. Вельмі маляўніча паказана асяроддзе працоўных яўрэяў і іх інтэрнацыянальнае садружаства з беларускімі сялянамі.

П'есу ставіць рэжысёр А. Е. Трэпель, рэжысёр-асістэнт І. Герман. Пастаноўку афармляе А. Я. Кіпніс. Музыку да пастаноўкі напісалі кампазітары А. В. Штэйнбах і С. П. Эмерман. Кампазітарамі выкарыстан багаты яўрэйскі і беларускі музыкальны і песенны фальклор.

Гэтымі днямі адбудзецца прагляд спектакля.

З. Л.

Совецкая інтэлігенцыя

У ДНІ XXI гадавіны Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі Совецкая Беларусь, як і ўсе братнія рэспублікі вялікага Совецкага Саюза, адзначае новыя поспехі ў развіцці соцыялістычнай культуры. Гэтыя поспехі, дасягнутыя пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, непарыўна звязаны з ростам нашай інтэлігенцыі, выхаванай совецкім народам.

Совецкі інтэлігент — ганаровае званне!

Надзвычайна поўна і ярка характарызуе ролю інтэлігенцыі вялікі дакумент нашай эпохі — Гісторыя ВКП(б):

«Змянілася і інтэлігенцыя СССР. У масе яна стала зусім новай інтэлігенцыяй. У большасці яна выйшла з рабочага і сялянскага асяроддзя. Яна служыць не капіталізму, як старая інтэлігенцыя, а соцыялізму. Інтэлігенцыя стала роўнапраўным членам соцыялістычнага грамадства. Гэта інтэлігенцыя будуе разам з рабочымі і сялянамі новае соцыялістычнае грамадства. Гэта — новы тып інтэлігенцыі, якая служыць народу і вызвалена ад усякай эксплаатацыі. Такой інтэлігенцыі не ведала яшчэ гісторыя чалавецтва».

Інтэлігенцыя царскай Расіі рэкрутыравалася, галоўным чынам, з буржуазнага, памешчыцкага асяроддзя і з'яўлялася ў пераважнасці выразнікам ідэй капіталізма, была служкай пануючых эксплаататарскіх класаў. У асноўнай масе інтэлігенцыі працоўны народ бачыў пасобнікаў і наймітаў капіталізма. Прадстаўнікі перадавой думкі—былі астраўкамі ў моры ілжы, падхалімства, подласці, — таго, чым адзначалася гэтая асноўная маса так званай «інтэлігенцыі» царскай Расіі.

Зараз інтэлігенцыя капіталістычных краін знаходзіцца ў двух супроцьлеглых лагерах.

Есць лагер фашысцкіх мракабесаў, душыцелей прагрэсу чалавецтва. У гэтым лагеры зброд крэтынаў і выродкаў — прадстаўнікоў і наймітаў крывавага фашызма.

І ёсць лагер дэмакратычнай, прагрэсіўнай інтэлігенцыі. Лагер барацьбітоў за прагрэс і культуру, барацьбітоў супроць вайны і фашызма. Творы прадстаўнікоў гэтага лагера гарэлі на дзікунскіх вогнішчах у ночы крывавых оргій фашысцкіх катаў. Творы прадстаўнікоў гэтага лагера натхняюць народы Іспаніі і Кітая ў барацьбе супроць фашысцкіх агрэсараў, заклікаюць працоўных усіх краін змагацца за мір і дэмакратыю — супроць фашызма. У гэтым лагеры сябры і прыхільнікі соцыялістычнай культуры народаў Совецкага Саюза. У гэтым лагеры поруч з вялікім гуманістам Рамэн Раланам змагаюцца дзесяткі і сотні сапраўдных барацьбітоў культуры чалавецтва.

Быць інтэлігентам у нашай краіне перамогшага соцыялізма — вялікі гонар, высокае прызванне.

Нябачана вялікі, няспынны рост кадраў совецкай інтэлігенцыі — вынік пабеданоснага руху краіны да комунізма.

Лепшыя прадстаўнікі нашай інтэлігенцыі — лепшыя сыны вялікага совецкага народа. Гэта Стаханаў і Папанін, якія «сталі наватарамі ў навуцы, людзьмі нашай перадавой навукі» (Сталін). Гэта Дзюканаў, Крыванос, Ізотаў і многія іншыя — былыя забойшчыкі і машыністы, стаўшыя арганізатарамі і кіраўнікамі важнейшых участкаў соцыялістычнай гаспадаркі.

Колькі соцень і тысяч сыноў і дачок нашага совецкага народа стала выдатнымі дзеячамі культуры, совецкімі інтэлігентамі. Толькі днямі ўвесь совецкі народ з гарачым пачуццём любві віншаваў трох мужных дачок сваіх — лётчыц, уславіўшых перад усім светам росквіт нашай авіяцыйнай культуры.

І тыя, хто губляў глебу пад нагамі, задыхаўся ва ўмовах змрочнай царскай Расіі, зараз, пад нязгасным сонцам Сталінскай Канстытуцыі, знайшлі шлях да яркага росквіту, велізарнага творчага ўздыму ў совецкай краіне.

Гэта перад усім светам з надзвычайнай сілай прадэманстраваў Маскоўскі зараз двойчы ордэнаносны Мастацкі Акадэмічны тэатр імя М. Горкага, 40-гадовы юбілей якога днямі адзначан усёй грамадскасцю Совецкага Саюза. МХАТ, які аб'яднаў яшчэ ў дарэвалюцыйныя годы лепшых і перадавых прадстаўнікоў рускай тэатральнай культуры, стаў лепшым прадстаўніком совецкага мастацтва, соцыялістычнай культуры.

Совецкая інтэлігенцыя складаецца з тых прадстаўнікоў старой інтэлігенцыі, якія пасля Кастрычніка аддалі свой талент і майстэрства на службу народу, і тых, хто ўзрошчан і выпеставан совецкай краінай. Совецкая інтэлігенцыя — неад'емная частка працоўнага совецкага народа.

З надзвычайнай увагай, з вялікай любоўю адносіцца партыя Леніна — Сталіна, вялікі Сталін да тварцоў нашай культуры — совецкай інтэлігенцыі. Клопаты партыі, вялікага правадыра і друга нашага народа таварыша Сталіна забяспечылі стварэнне і росквіт культуры Совецкай Беларусі.

За годы совецкай улады ў нашай рэспубліцы выраслі выдатныя кадры совецкай інтэлігенцыі.

Совецкая Беларусь узгадавала сваіх кампазітараў. І лепшыя з іх — аўтары першых беларускіх опер, масавых песень і яркіх музычных твораў тт. Туранкоў і Багатыроў з'яўляюцца дэпутатамі Вярхоўнага Совета БССР.

Совецкая Беларусь вырасціла таленавітых салістаў оперы, як засл. арт. рэсп. Александроўская, артыстка Кроз і інш.

Былы рабочы тав. Ю. Палічынецкі стаў рэжысёрам. Ад сялянскага хлапца да мастацкага кіраўніка рэспубліканскага драматычнага тэатра — шлях тав. Л. Рахленка.

А колькі ёсць выдатных актораў! Актор Дзяржаўнага віцебскага тэатра тав. Малчанаў у спектаклі «Чалавек з ружжом» стварыў вобраз Леніна. Гэта праца паказвае ўздым ідэйнага палітычнага ўзбраення і вялікі рост майстэрства нашых актораў.

Малады беларускі мастак Зайцаў атрымаў вышэйшую мастацкую асвету і стварае яркія творы жывапісу.

Гэта — прадстаўнікі беларускай совецкай інтэлігенцыі. Іх з глыбінь народных мас узняла, дала асвету і вывяла на творчы шлях совецкая ўлада.

Расце наша совецкая літаратура. Тварцы яе—нашы пісьменнікі, паэты і драматургі — таленавітыя прадстаўнікі нашага народа, перад якімі толькі Вялікі Кастрычнік адкрыў цудоўную перспектыву творчай працы. Ва ўмовах царскай Расіі яны ніколі не маглі-б здабыць шчасця быць майстрамі мастацкага слова.

Так, дзякуючы клопатам партыі Леніна — Сталіна, клопатам совецкай улады сталі пісьменнікамі Лынькоў, Самуйлёнак, Броўка, Куляшоў, Клімковіч і многія іншыя.

Колькі яшчэ можна назваць імён майстроў усіх галін мастацтва, якія плённа, творча працуюць на карысць нашага народа. Дзесяткі, сотні імён — сыноў і дачок нашага народа.

Поруч з маладымі прадстаўнікамі совецкай інтэлігенцыі плённа працуюць кадры старога пакалення. Гэта — народныя паэты рэспублікі Янка Купала, Якуб Колас і іншыя — у літаратуры, мастацтве, ва ўсіх галінах культуры.

Нашых майстроў культуры натхняюць радзіма, партыя Леніна—Сталіна.

З кожным годам узрастае армія совецкай інтэлігенцыі. Сталінская Канстытуцыя забяспечыла ўсім працоўным права на асвету. Перамогі соцыялізма адкрылі ўсім працоўным нашай краіны шырокі шлях да авалодання ведамі, усімі багаццямі сусветнай культуры.

Кожны год сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы даюць рэспубліцы новыя і новыя атрады педагогаў, урачоў, інжынераў, тэхнікаў, музыкантаў, мастакоў — спецыялістаў розных галін інтэлектуальнай працы.

Ва ўсіх галінах культуры, гаспадарчага будаўніцтва, дзяржаўнай дзейнасці совецкая інтэлігенцыя займае пачэснае месца. Нездарма совецкі народ лепшых прадстаўнікоў сваёй інтэлігенцыі абраў дэпутатамі вышэйшых органаў улады Саюза ССР і рэспублікі. Гэта падкрэслівае кроўную сувязь інтэлігенцыі з народам, глыбокую павагу і любоў, з якой адносіцца наш народ да перадавых людзей нашага часу — совецкай інтэлігенцыі. І таму па-праву нашу інтэлігенцыю, майстроў нашай, перадавой у свеце, культуры —народ называе солллю зямлі совецкай.

Вялікі правадыр народаў таварыш Сталін указваў і ўказвае на неабходнасць надзвычайна клапатліва і беражна адносіцца да кадраў інтэлігенцыі, да яе запатрабаванняў, на неабходнасць узбраення інтэлігенцыі большэвізмам.

Марксісцка-ленінскае выхаванне інтэлігенцыі — пярвейшая і важнейшая задача.

У вырашэнні гэтай задачы галоўнейшую ролю адыгрывае вывучэнне гісторыі ВКП(б) — навуковай працы сусветна-гістарычнага значэння, магутнай зброі марксізма-ленінізма.

Ідэйнае ўзбраенне большэвізмам — асноўная ўмова ўздыму палітычнай і творчай актыўнасці інтэлігенцыі, што забяспечыць далейшы рост нашай культуры, далейшыя перамогі па шляху да комунізма.

Палітычнае, ідэйнае выхаванне кадраў нашай інтэлігенцыі свядома зрывалі ворагі народа. Гэта быў дыверсійны акт па падрыву нашай соцыялістычнай культуры. Рэшткі подлага шкодніцтва павінны быць у самы кароткі час цалкам ліквідаваны.

Недаравальна-ж тое, што ў літаратуры і мастацтве Совецкай Беларусі не адлюстравана інтэлектуальная праца нашай рэспублікі — лепшых людзей нашай эпохі. Хіба-ж можа наш пісьменнік, майстар мастацтва, стаць сапраўдным «інжынерам чалавечых душ», калі ён не ўзнімецца на ўзровень эпохі, не будзе ідэалагічна падрыхтаван так, як падрыхтаваны перадавыя людзі нашага грамадства?

Майстры перадавой у свеце соцыялістычнай культуры павінны быць узброены самай магутнай зброяй у барацьбе за комунізм — марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Авалоданне марксізмам-ленінізмам адыграе рашаючую ролю ў росце майстэрства і ідэйнай насычанасці твораў мастацтва, у стварэнні выдатных твораў пра квітнеючыя дні соцыялізма, пра вялікую сталінскую эпоху.

У дні XXI гадавіны Вялікага Кастрычніка, падводзячы вынікі поспехаў у развіцці соцыялістычнай культуры, совецкі народ горда адзначае вялікую працу совецкай інтэлігенцыі на карысць соцыялізма і ставіць новыя адказныя задачы ў справе выхавання кадраў інтэлігенцыі, у справе далейшага няспыннага пераможнага руху да комунізма.

Юр. РУДЗЬКО.

ЗА ДАЛЕЙШЫ РОСКВІТ КУЛЬТУРЫ НАРОДАЎ СССР, ЗА НОВЫЯ ПОСПЕХІ СОВЕЦКАЙ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І МАСТАЦТВА!

ДЭМАНСТРАЦЫЯ НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ

ВЫНІКІ III УСЕБЕЛАРУСКАЙ АЛІМПІЯДЫ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ



Выступленне калектыва гомельскага чыгуначнага клуба імя Леніна

Невычарпальнай крыніцай б'е народная творчасць у нашай вялікай краіне. Пад яркімі, граючымі, клапатлівымі праменнямі сталінскага сонца расцвітаюць мастацтвы нашага народа.

Радасным, шчаслівым жыццём жыве беларускі народ, квітнеюць яго таленты, яго здольнасці. З кожным годам усё шырэй і мацней развіваюцца, даючы ўсё новыя і новыя пара-

Беларускі народ, пасылаючы лепшых прадстаўнікоў свайго самадзейнага мастацтва на III Усебеларускую алімпіяду, прысвечаную слаўным датам — XX-годдзю ленінска-сталінскага комсамола і XXI гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, свае першае слова праз сваіх пасланнікаў перадаваў другу, настаўніку, правадыру і бацьку — вялікаму Сталіну.

Прымі прывітанне, якое прыносіць Табе, правадыр, беларускі народ!

Не было ні аднаго калектыва, які-б у той ці іншай форме не выразіў гэтага прывітання — ці песнямі совецкіх кампазітараў (Александрава, Дунаеўскага, Пакрас, Рэвуцкага, Сабо, Туранкова і інш.), ці вершамі, ці частушкамі, з якіх многія складзены ў саміх калектывах.

Бадзёрасць, жыццёрадаснасць, вясёласць, яркасць, тэмпераментнасць, палітычная накіраванасць — былі тым агульным фонам, на якім праходзілі выступленні гурткоў і асобных выканаўцаў. Гэты агульны фон адчуваўся ва ўсіх выступленнях удзельнікаў — ад 7-гадовай даяўчынкі Бохаць (калгас «Ленінскі шлях» Менскай вобласці) да 74-гадовай калгасніцы-стаханаўкі Сычковай (Мсціслаўскі раён).

Не менш цікавы і іншыя паказчыкі алімпіяды. Па-першае, яе масавасць. Хочацца прывесці дзве лічбы. Калі II рэспубліканская алімпіяда мела каля 700 удзельнікаў, прычым на раёны прыходзілася не больш 300, дык III мела ўжо каля 2.000 удзельнікаў, з іх больш паловы падала на раёны. Па-другое, узнялася якасць выступленняў.

Далей, прыкметна пашырыўся рэпертуар выступленняў за лік авалодання класічнай спадчынай (Шуберт, Бетховен, Госек, Люлі, Тома, Даргамыжскі, Рубінштэйн і інш.) і творчасцю совецкіх кампазітараў, за лік уключэння ў рэпертуар песень і танцаў народаў братніх рэспублік (рускія, грузінскія, украінскія, цыганскія, яўрэйскія песні і танцы).

Пашырэнне рэпертуару і выканаўчых жанраў ідзе і па лініі беларускага фальклору. Удзельнікі прывезлі на алімпіяду шмат малавядомых беларускіх частушак, песень, танцаў. Беларускі народ любоўна захоўвае выдатную народную творчасць мінулага, сам стварае новы совецкі фальклор. Для прыкладу прывядзем такія выдатныя песні, як «Ясна сонца закацілася», «Плыве лебедзь» (хор Слуцкага раёна), «Ой, не думала я», «Піла я гарэліцу» (дуэт калгасніц Галец і Якімовіч з Слуцкага раёна), «Ой, вярба», «Салавей», «Ой ты, сад» (калгасны жаночы хор Прапойскага раёна), але частушкі пра Сталіна, пра Варашылава, пра Ежова, аб Канстытуцыі, калгасныя частушкі, якія гавораць аб правадырах, аб новым красачным жыцці народа, аб яго стаханаўскай, ударнай працы, аб яго здаровым, вясёлым быце.

Выключна цікавы народныя беларускія гульні і танцы: «Лянок», «Пляцуцка», «Беларуская кадрыль», «Шостак», «Мікіта», «Талока». Большасць іх прывезена гуртком Хойніцкага соўгаса і калектывам Асіпавіцкага раёна.

Сярод паказаных на алімпіядзе беларускіх народных інструментаў асабліва прыцягнулі ўвагу аднаўленыя самімі калгаснікамі-выканаўцамі старадаўнія беларускія дуды (нагадваючыя валынку), якія ўяўляюць велізарную этнаграфічную каштоўнасць. Ігралі на іх калгаснікі Полацкага раёна Стэсь і Усцінаў. Затым дудкі, сапілкі, жалейкі (калгаснікі Новікаў — Сіроцінскі раён, Кабардынскі — Бабруйскі раён, Аўтуховіч — Бярэзінскі раён і інш.) і, нарэшце, цымбалы — ад сольнага выканання да рознага ліку ансамбляў.



Наборшчыца Н. Паўлава і тэлефаністка П. Хмелькова (Расонскі раён) выконваюць абаронныя частушкі.

Драмгурткі, хоры, аркестры (духавыя, народныя), ансамблі песень і танцаў, танцавальныя калектывы, спевакі, скрыпачы, чытальнікі, акрабаты, балалаечнікі, баяністы, мастакі-маментalісты, жанглёры, мастацкі свіст, гукапераймание, плясуны, танцоры, цымбалісты, дудары, жалеечнікі, дамрысты, гітарысты — вось разнастайныя жанры III алімпіяды, стварыўшыя ў рознастайных формах маляўнічае, яркае відовішча.

Выступленнямі, якія занялі віднае месца на алімпіядзе, якія літаральна здзівілі і захапілі прадстаўнікоў мастацкай грамадскасці братніх рэспублік (Масква, Ленінград, Кіеў, Данбас, Днепрапетроўск), былі народныя пляскі і танцы. Гэты від мастацтва ў самадзейнасці Беларусі стаіць на выключнай вышыні па майстэрству і па тэмпераментнасці выканання. Асабліва гэта адносіцца да беларускіх народных танцаў. Ад выканання «Лявоніхі» гуртком Хойніцкай МТС не адставалі і танцавальныя нумары калектыва гомельскага чыгуначнага клуба («Руская пляска»), і народныя беларускія пляскі калектыва Хойніцкага соўгаса і калгаснікаў Асіпавіцкага раёна («Кадрыль», «Шостак», «Мікіта», «Талока»), і цыганскія танцы танцавальнага калектыва калгаса імя К. Маркса (Полацкі раён), і танцавальны калектыў Хойніцкага леспрамгаса («Крыжачок»).

На вялікай вышыні стаіць культура народных хораў. Выдатнымі выканаўцамі гэтага віду мастацтва паказалі сябе калгасны хор Рэчыцкага раёна з яго надзвычайным самародкам майстрам-кіраўніцай тав. Лапацінай, калгасны жаночы хор Прапойскага раёна, калгасны ансамбль песні і пляскі Шклоўскага раёна.

Рад калектываў з вялікім поспехам авалодвае культурай прафесіянальных хораў, складанай чатырохгалоснай партытурай, ансамблевай гучнасцю. Лепшыя з іх — мужчынскі хор саюза сувязі гор. Магілева з яго чуллівай і здольнай кіраўніцай тав. Станкевіч, які па-мастацку выконвае «Ночаньку» з оперы «Дэман» Рубінштэйна, і калгасны хор Княжыцкага сельсовета Магілеўскай вобласці.

З інструментальных ансамбляў выдатнае месца занялі два цымбальных калектывы — Дзержынскага сельсовета і гомельскага клуба чыгуначнікаў. Першы — сваёю непасрэднасцю, якой сьці асабліва захапляючай выразнасцю выкананія, другі — тонкасцю, аддзелкай, майстэрствам. Вялікай каштоўнасцю было выступленне інструментальнага ансамбля сям'і Ржэўскіх (Менская вобласць), выявіўшае добрыя здольнасці.

Добра выступіў калектыў студэнтаў Менскага палітэхнічнага інстытута (хор, джаз і чытальнікі).

З аддзінак, — аб многіх мы ўжо сказалі, — варта адзначыць танцора Махліна (Віцебск), Манцюковіч (Менск) — мастацкая чытка, частушачніцу Гарохаву (Асінторф), Сільчэнка (Горацкі сельгасінстытут), спявачку Левіну (Гарадок, Віцебскай вобласці), выканаўцу народных беларускіх песень Шэршнёву (Асінторф), Мядзведзеву (Магілеў), Жэўняк (Хойнікі), спевакоў Аўсяннікава (Пухавічы), Бараначнікава (Магілеў). Мы не маем магчымасці ў гамерах газетнага артыкула назваць усе нумары, якія атрымалі адабрэнне і прадстаўлены да прэміравання. Мы ўказалі тут толькі лепшых з лепшых. Даволі прывесці такі факт, што журы дала станоўчую ацэнку звыш 60 процантам выканаўцаў інструментальна-вакальных нумароў.

**

Асноўным недахопам, які выявіўся на алімпіядзе, з'яўляецца зусім недастатковае і слабае кіраўніцтва вялікай арміяй самадзейнасці (раённыя і абласныя алімпіяды налічвалі больш 60 тысяч удзельнікаў) як з боку рэспубліканскага Дома народнай творчасці, так і з боку мясцовых органаў Наркомасветы і Упраўлення па справах мастацтваў, якія не аддавалі гэтай палітычна важнай справе належнай увагі.

У цэлым па абласцях работа па арганізацыі самадзейнасці не разгорнута, вобласць прадстаўляюць часам толькі гарадскія калектывы (у гэтым выпадку добрым выключэннем з'яўляюцца Магілеўская і часткова Віцебская вобласць). Вялікім недахопам з'яўляецца і слабая, а на месцах і поўная адсутнасць метадычнай работы, вучэбна-выхаваўчых элементаў у рабоце, без чаго сапраўдная работа ў мастацтве немагчыма.

Перад самадзейным мастацтвам Беларусі ва ўсю шырыню стаіць задача падрыхтоўкі да Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі і дэкады беларускага мастацтва. Гэта павінна паслужыць стымулам для рэалізацыі вынікаў III Усебеларускай алімпіяды.

Квітнеючая творчасць народа павінна атрымаць належныя клопаты, дапамогу і кіраўніцтва і тады яна дасць яшчэ большыя паказчыкі. Стварэннем умоў для развіцця ў шырыню і ў глыбіню выдатных народных талентаў мы павінны адзначыць дату XXI гадавіны Вялікага Кастрычніка.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

АД САМАДЗЕЙНАСЦІ ДА ПРАФЕСІЯНАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

Дваццаць адзін год совецкай улады перабудавалі нашу краіну да непазнавальнасці. Замест адсталай царскай Расіі жыве і дыхае поўнымі грудзьмі неабсяжны Совецкі Саюз. Жыць стала весялей, і песні таксама сталі іншымі. Радасныя, бадзёрыя песні, насычаныя гарачай любоўю да нашай радзімы, спявае ўся краіна.

Наша партыя, яе ЦК і мудры настаўнік і правадыр наш любімы Сталін аддаюць пытанням мастацтва шмат увагі.

Кампазітары, якія стварылі цудоўныя творы, узнагароджаны вышэйшымі адзнакамі. Дзесяткі лаўрэатаў даў Совецкі Саюз на міжнародных конкурсах, прычым усе лаўрэаты — выхаванцы Кастрычніка.

Мне хочацца напісаць некалькі слоў аб нашых маладых працаўніках мастацтва, якія прарабілі вельмі цікавы жыццёвы шлях ад калгасных палёў, ад рабочага варштата — да прафесіянальнага мастацтва.

Хор Дзяржаўнай філармоніі БССР налічвае сёння каля 60 чалавек, большасць з іх — моладзь, наша добрая совецкая моладзь.

З першых дзён арганізацыі Філармоніі (май 1937) у хоры арганізавана планамерная вучоба (па вакалу, музтэарэтычных дысцыплінах, палітвучоба і г. д.) усё, што хор спявае ў канцэрце, загадзя развучваецца ў плане замацавання вучэбных заняткаў, і можна смела сказаць, што людзі, працуючыя ў хоры Філармоніі, набываюць моцную кваліфікацыю.

Я не маю магчымасці ў невялікім артыкуле расказаць аб усёй нашай здольнай моладзі. Раскажу аб некаторых.

Аня Тарасевіч была ў дзіцячым доме (бацькі — сяляне памерлі), потым паступіла на цагельны завод. На заводзе ў гуртку самадзейнасці выявілася, што ў Ані надрэнны голас. Аня затым працавала на хлебазаводзе і адтуль паступіла ў хор Філармоніі. Цяпер ёй 22 гады, яна моцна авалодвае сваёй новай спецыяльнасцю.

Каларытная фігура маладога спевака Віктара Башлакова. Сын селяніна, Віктар рана пачаў працаваць. Служыў у РСЧА, вярнуўся адтуль камандзірам запасу і комсамольцам. Потым прышоў да нас і за два гады дабіўся вялікіх поспехаў.

Барсукова працавала 8 год на грыкатажнай фабрыцы. Удзельніца самадзейнасці. У 1938 годзе паступіла на конкурсу да нас у хор і за тры месяцы значна пасунулася наперад. Барсуковай 22 гады, яна комсамолка, валодае прыгожым голасам (сапрано). Недалёка той час, калі яна стане салісткай хора.

Васіль Сямёнавіч Шкляр — настаўнік з Шклоўскага раёна. Мы даведаліся праз Дом народнай творчасці аб тым, што тав. Шкляр умее спяваць. Праверылі, і цяпер Дзяржфілармонія мае ў сваіх радах добрага спевака.

Упарта авалодвае мастацтвам харавой справы комсамолец Нікіцін, у мінулым рабочы-друкар. Тав. Нікіцін паказвае ўзоры сур'ёзных адносін да справы.

Оля Акімава і Валя Міленушкіна — шматабяцаючая пара. Ім абедзвюм 36 год — кожнай па 18. Трапілі яны ў хор з самадзейных харавых гурткоў.

Добра працуе Геня Гоберман, у мінулым наборшчыца друкарні Соўнаркома (Менск). Яна таксама моцна ступае па сваім жыццёвым шляху.

Оля Крывец — дачка пастуха, сямі год пайшла ў нянькі. Цяпер яна артыстка Дзяржаўнага хора БССР. Нядаўна хор канцэртыраваў на радзіме Олі — у мястэчку Зембін, шмат цікавых размоў і ўспамін было ў часе сустрэчы.

Слёсар менскага дэпо Рудкоўскі, наборшчык Падальскі і многія, многія іншыя артысты хора прарабілі цікавы шлях ад рабочага варштата да прафесіянальнага мастацтва.

Шмат талентаў у нашым народзе і наша задача — няспынна іх высоўваць, дапамагаць ім, сачыць за іх ростам і найбольш адароным даваць правільны напрамак у выбары новай спецыяльнасці, пры пераходзе ў рады работнікаў прафесіянальнага мастацтва.

Нажаль, мы яшчэ мала ведаем нашых таленавітых самародкаў, музыкальна адароных людзей і таму маем вялікую патрэбу ў кадрах.

У хор Філармоніі прыбываюць новыя людзі з гурткоў самадзейнасці, але гэта, вядома, недастаткова. Наша партыя і ўрад даюць нам усе магчымасці для таго, каб разгарнуць шырэй —колькасна і якасна — нашу работу. На дапамогу нам павінны прыйсці культработнікі, кіраўнікі гурткоў самадзейнасці, уцягваючы ў мастацкую самадзейнасць як мага больш людзей.

Перад хорам Дзяржфілармоніі стаяць вялікія задачы. Галоўнейшай з іх мы лічым прадстаўчы паказ беларускага мастацтва ў 1939 годзе ў Маскве кіраўнікам партыі і ўрада, працоўным чырвонай сталіцы, працоўным ўсяго Совецкага Саюза.

Наша гарачае жаданне працаваць, нашы цудоўныя народныя таленты, наша моладзь, наша любоў да радзімы і яе вялікага правадыра таварыша Сталіна мацуюць нашу ўпэўненасць у тым, што мы з пастаўленымі перад намі задачамі справімся.

І. БАРЫ — мастацкі кіраўнік хора Дзяржфілармоніі.



Прыма-балерына З. Васільева і К. Мулер у Беларускім тэатры оперы і балета (балет «Лебядзінае возера» Чайкоўскага).

„ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА"

Геніяльны рускі кампазітар П. І. Чайкоўскі быў уладаром дум і імкненняў перадавой інтэлігенцыі 80—90-х гадоў мінулага стагоддзя. Ен узбагаціў рускую і сусветную культуру неўміручымі музыкальнымі творамі ў рознастайных жанрах і формах. Шэсць сімфоній, дзесяць опер («Пікавая дама», «Еўгеній Онегін», «Мазепа» і інш.), тры балеты, аркестравыя сюіты, струнныя квартэты, секстэты, фортэп'янныя п'есы і рамансы, канцэртна-віртуозны жанр — багацейшая спадчына вялікага кампазітара.

П. І. Чайкоўскі зрабіў выключны ўплыў на развіццё цэлага пакалення дарэволюцыйных кампазітараў. Лепшыя совецкія кампазітары свайму музыкальнаму росту ў вялікай меры абавязаны вучобе ў Чайкоўскага.


Балеты Чайкоўскага — лепшыя ва ўсёй сусветнай балетнай літаратуры.

Спектакль «Лебядзінае возера», пастаўлены Беларускім дзяржаўным тэатрам оперы і балета да 45 гадавіны з дня смерці П. І. Чайкоўскага, ушаноўвае памяць геніяльнага рускага кампазітара.

Напісаны ў 1875—76 гадах, гэты балет, па вобразнаму выразу вядомага совецкага кампазітара і музыказнаўца Б. Асаф'ева (Ігара Глебава): «узнікнуў у бліскучы час вясенняга ўздыму даравання Чайкоўскага». Мелодыка балета, як і іншых твораў, напісаных кампазітарам у гэты час, — мелодыка вялікага дыхання, глыбокай лірычнай сілы і хвалюючага драматызма.

Лірыка-сімфанічны па свайму музыкальнаму зместу балет «Лебядзінае возера» адлюстроўвае «праўдзівую драму асобы, якая праз каханне шукае выйсця за межы амярцвеўшага абкружаючага жыцця». Каханне казачнага, рамантычнага прынца Зігфрыда і даяўчыны—Лебедзі — харэаграфічная паэма аб вялікіх страсцях і чалавечых пачуццях, якія па сваёй глыбіні і трагічнай сіле ўзыходзяць да сумнай аповесці аб каханні Ромео і Джульеты. Аб настаноўцы такога трагедыйнага балета марыў яшчэ «Шэкспір танца»— Жорж Новэр.

Балет Чайкоўскага адпавядаў дэмакратычным імкненням і думам тагочаснай перадавой інтэлігенцыі, адным з лепшых прадстаўнікоў якой быў сам вялікі кампазітар.



6 лістапада споўнілася 45 год з дня смерці геніяльнага рускага кампазітара П. І. Чайкоўскага.

—О—

Харэаграфічны змест балета вынікае з цудоўнай сімфанічнай музыкі. Праблема класічнага танца кампазітарам-рэалістам вырашана ў напрамку стварэння лірыка-сімфанічнага танца ў супроцьлегласць балетам Пуні і Мінкуса, дзе немастацкая «безыдэйная» музыка была больш ці менш удалым суправаджэннем танцаў.

Меладычнае багацце і глыбокі драматызм музыкі «Лебядзінага возера» па-сапраўднаму зразумеў рускі балетмейстар, які жыў у другой палове XIX стагоддзя, Леў Іваноў, вучань Марыуса Пеціпа. Усе пазнейшыя пастаноўкі балета на рускай сцэне знаходзіліся пад значным уплывам спектакля Іванова і Пеціпа, які быў ажыццёўлен у былым Марыінскім тэатры.

На совецкай сцэне лепшая пастаноўка гэтага балета належыць ленінградскаму балетмейстару і вядомаму балетнаму педагогу Ваганавай.

Спектакль «Лебядзінае возера» ў нашым тэатры (балетмейстар К. А. Мулер, мастак Б. Матрунін) радуе перш за ўсё тым, што лірыка-сімфанічная музыка Чайкоўскага дапамагла ўзняццю харэаграфічнай і музыкальнай культуры балетнага калектыва, наблізіла яго да сімфанічнага і псіхалагічна паглыбленага танца. Музыка вялікага дыхання сваім вольным і чыстым паветрам напоўніла танец жыццём, раднымі і сумнымі чалавечымі эмоцыямі.

«Лейт-рухі» танцаў лебедзяў, пабудова груп, іх позы і ходы раскрываюць лірычную драму і глыбокія эмацыянальныя канфлікты. Светла-сумны лебядзіны мелас пранікае ўсе кампаненты танцаў. Балетмейстару ўдалося эмацыянальнае багацце танцаў лебедзяў выразіць жывым, пераканаўчым харэаграфічным рысункам. Яму таксама ўдалася жывая імітацыя тыповых рухаў лебедзя.

Есць у спектаклі яшчэ цікавыя па рысунку і эмацыянальнаму напаўненню класічныя танцы: балетнае трыо (першы акт), танцы трох і чатырох лебедзяў (другі акт) і т. з. характэрныя танцы — іспанскі і чардаш.

Асноўным недахопам у рабоце балетмейстара К. А. Мулера над спектаклем мы лічым адсутнасць у яго ўпэўненай рэжысёрскай рукі. Рэжысура Мулера абмежавалася выключна распланіроўкай маляўнічых і ў сваёй аснове пікавых мізансцэн. Музыка Чайкоўскага падказвала балетмейстару стыль вырашэння спектакля—стыль музыкальнай лірычнай драмы. Балетмейстар павінен быў больш заваёстрыць сюжэтныя сітуацыі і скарыстаць першы акт у якасці экспазіцыі да ўсяго спектакля, а цяпер у першым акце пераважаюць забаўляльныя і несюжэтныя танцы.

Сюжэтныя танцы не занялі ў спектаклі дамініруючай ролі, а іх вельмі часта выцясняюць прыгожыя па рысунку, але самадаўлеючыя па свайму значэнню класічныя танцы.

Асаблівае неўразуменне выклікае фінал спектакля — маляўнічая поза лебедзяў на чале з Зігфрыдам і Одэтай на фоне ўзыходзячага сонца. Гэта супярэчыць усёй канцэпцыі музыкі балета, згодна якой лёс кахання Зігфрыды і Одэты завяршаецца трагічна.

У жывапісных дэкарацыях мастака Матруніна радуюць зрок лірычныя пейзажы, якія ствараюць каларыт і настрой да лірычных сцэн і танцаў. Незразумелым у афармленні з'яўляецца толькі сімвалічна абагуленыя і стракатыя дэкарацыі палаца герцага (III акт). Прыгожыя і рознастайныя касцюмы па сваёй танальнасці і колеру не заўсёды адпавядаюць фарбавай палітры дэкарацыі. У прыватнасці, стракатасць і балетная кваяцістасць уласціва касцюмам паляўнічых.

Дырыжор-ордэнаносец Н. Б. Грубін, з мастацкай чуласцю і тактам раскрываючы меладычныя багацці партытуры балета Чайкоўскага, вельмі культурна і ўмела вядзе спектакль. Дырыжору застаецца толькі пажадаць удасканаленне тэмпаў. У першую чаргу нам хочацца перасцерагчы Н. Б. Грубіна ад залішняга замаруджвання тэмпаў балета наперакор партытуры, што парушае рытмічны малюнак танцаў і правільнае ўспрыманне самой музыкі.

Галоўная дадатная вартасць спектакля — выкананне паасобных партый, масавых і ансамблевых танцаў.

Партыю Одэты і Одыліі танцуюць артысткі З. А. Васільева і А. В. Нікалаева. Выдатная балерына Васільева, бездакорны і выразны па рысунку класічны танец напаўняе велізарным унутраным тэмпераментам і экспрэсіяй. Ей чужды мімічная імітацыя, якая штучна прыўнесена ў балет з драматычнага тэатра. Рэалістычны вобраз Васільева раскрывае толькі праз танец і ў гэтым яе мастацкая сіла.

Лейт-тэма Одэты — Васільевай — драматызм, глыбокія пакуты, сіла і шчырасць любоўнага пачуцця. Для раскрыцця гэтай тэмы Васільева карыстаецца ўсімі кампанентамі цела. У танцы з аднолькавай мастацкай выразнасцю ўдзельнічаюць ногі, корпус і рукі. Патрабаванні Новэра і Блазіса: «мала танцаваць нагамі, патрэбна таксама танцаваць корпусам і рукамі» знаходзіць ажыццяўленне ў творчай практыцы совецкай балерыны Васільевай.

У рухах і позах Васільевай—Одэты, у любоўных дуэтах з Зігфрыдам адчуванне Лебедзя — яе гордасці і пяшчоты, імклівасці і пакорнасці, сілы і грацыі—непаўторны. Яны выяўляюцца выключна індывідуальна, выходзячы з творчага тэмпераменту і мастацкага профілю балерыны. Прыгожыя ўзлёты, томныя замаруджаныя кругавыя рухі і піруэты ў руках кавалера, поза плывучага арабеска і бег на насках — узоры цудоўнага майстэрства Васільевай. Лірыка-сімфанічная глыбіня харэаграфічнага малюнка вобраза Одэты ў Васільевай знаходзіцца ў арганічным адзінстве з музыкай. Артыстка ў апошняй карціне з велізарнай экспрэсіяй перадае трагічную асуджанасць шчырага і чыстага кахання. Без сувязі з музыкай нельга ўспрыняць і зразумець тут ніводнага па і ніводнага руху балерыны. Васільева ў творчым парыве цалкам зліваецца з музыкай, ствараючы непаўторную па сваёй сіле харэаграфічную паэму аб вялікіх чалавечых пачуццях і страсцях. Віртуоз класічнага танца, у варыяцыях трэцяга акта Васільева—Одылія з выключным уздымам і асляпляючым бляскам выконвае самы цяжкі класічны нумар—трыццаць два фуэтэ (кругі).

Мы з радасцю адзначаем, што ў асобе З. А. Васільевай Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета мае выдатную, высока адароную артыст-

Для А. В. Нікалаевай работа над партыяй Одэты і Одыліі—вялікая школа ў галіне авалодання вышынямі балетнай класікі. Здольная балерына Нікалаева раскрывае вобраз Одэты ўласцівымі яе тэмпераменту фарбамі. Одэта ў інтэрпрэтацыі Нікалаевай — мяккая і лірычная. Цеплыню і шчырасць, якія ўласцівы тэмпераменту балерыны, яна плённа скарыстала ў мастацкай інтэрпрэтацыі вобраза.

Партытура вобраза прадумана артысткай дасканала і ёю знойдзена скразная дзея. Унутраная сабранасць артысткі таксама дапамагла ёй у рабоце над вобразам Одэты і Одыліі. А. В. Нікалаева дамаглася сур'ёзнай творчай перамогі ў стварэнні класічнага вобраза.

К. А. Мулер у партыі Зігфрыда выявіў сябе як культурны і тэмпераментны танцоўшчык. Перажыванні Зігфрыда, яго думы і мары артыст перадае з мастацкім густам і ў мімічных і, асабліва, у танцавальных сцэнах. Варыяцыя Зігфрыда ў трэцім акце выканана Мулерам з вялікай экспрэсіяй. Асабліва тэмпераментныя і чоткія па форме яго прыжкі з захаваннем балона ў паветры і тэхнічна дасканалыя туры.

С. Дрэчын па вонкавых дадзеных, здольнасцях і абаянню — ідэальны танцоўшчык для партыі Зігфрыда. Але, як мы пісалі раней, прыемнае ўражанне ад выканання партыі Зігфрыда Дрэчыным пакуль-што ідзе ў большай меры за лік прыродных якасцей акцёра і ў меншай меры ад яго майстэрства. Дрэчын—таленавіты артыст, ён павінен і можа давесці выкананне партыі Зігфрыда да ўзроўню дасканаласці. У гэтым яму павінен сур'ёзна дапамагчы балетмейстар К. А. Мулер.

Варыяцыю і коду балетнага трыо першага акта віртуозна выконваюць артысткі Александра Пятрова і Ольга Дароніна. Асабліва ярка танцуе варыяцыю Пятрова, якая тэмпераментна і па рысунку выразна выконвае іспанскі танец. Пятровай і Даронінай нехапае яшчэ дастатковай унутранай цеплыні, каб давесці іх партыі да поўнага мастацкага гучання.

Мяккасцю рысунка, унутранай цеплынёй і задушэўнасцю характэрна выкананне артысткай Багдановай балетнага трыо і партыі нявесты. Чароўная артыстка мякка і з вялікай экспрэсіяй выконвае чардаш.

А. Петрашкевіч валодае мяккім прыжком і лёгкасцю тураў, але ён неўважлівы да чоткасці класічных поз.

Вельмі здольная малалая артыстка І. Брызгалава (танцуе балетнае трыо, партыю нявесты і ў «трох лебедзях»), але яе яшчэ часта захлёствае тэмперамент. Апрача гэтага, Брызгалава не заўсёды чула прыслухоўваецца да музыкі.

Танец «чатырох лебедзяў», пабудаваны на прыемнай і цёплай мелодыі, добра танцуюць артысткі Гімпелева, Новікава, Саушкіна і Марыя Спепанец. Чоткасцю рысунка і эмацыянальнай выразнасцю ў гэтай групе вылучаецца маладая і здольная танцоўшчыца Саушкіна.

З мастацкай экспрэсіяй танцуюць іспанскі танец і чардаш артысткі Рубіна і Узунава, артысты Гурвіч і Даронін.

Артыст Бабанін-Ардынскі танцуе мазурку «ў вобразе» з адценнем лёгкага гратэску, што вылучае яго выкананне сярод іншых танцоўшчыкаў. З выканаўцаў мімічных партый павінны быць адзначаны артысты І. Н. Ліпевіч у ролі «злога генія» і Ф. А. Пінно ў характэрнай ролі настаўніка Зігфрыда.

Спектакль «Лебядзінае возера» адкрывае шырокія перспектывы творчага росквіту Беларускага дзяржаўнага балета.

М. МОДЭЛЬ.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № Т—1073.